

Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

20 КАНАЛАЎ



Ёсць усё: ад свежай прэсы — да кавы

СТАР. 6




У пошуках незвычайнага падарунка...

СТАР. 8

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

22 ЛІСТАПАДА 2013 г. ПЯТНІЦА № 220 (27585) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## У АСНОВЕ — УЗАЕМНЫ ДАВЕР

**Афіцыйныя перамовы кіраўнікоў Беларусі і Азербайджана Аляксандра Лукашэнкі і Ільхама Аліева прайшлі ўчора ў загараднай рэзідэнцыі Прэзідэнта Азербайджана «Загульба», перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Пасля перамоў у фармаце сам-насам прайшла сустрэча ў пашыраным складзе з удзелам членаў дэлегацый. Па выніках перамоў адбылося падпісанне двухбаковых дакументаў аб развіцці супрацоўніцтва ў розных сферах.



Фота БЕЛТА.

«Асаблівасць гэтага візіту ў тым, што мы знайшлі новыя напрамкі супрацоўніцтва. Мы атрымалі сёння падтрымку і ад Прэзідэнта Азербайджана ў плане больш шырокага інвесціравання ў праекты, якія могуць цікавіць азербайджанскую дзяржаву, і ад бізнесменаў на беларускай тэрыторыі. Мы гатовы і чакаем вас з прапановамі», — заявіў Прэзідэнт Беларусі.

У якасці перспектыўных для азербайджанскіх інвестыцый сфер Аляксандр Лукашэнка назваў нафтахімію, сельскую гаспадарку, хімічную вытворчасць, фармацэўтыку.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, Беларусь можа аказаць садзейнічанне Азербайджану ў развіцці фармацэўтычнай прамысловасці. «Перад намі таксама калісьці стаяла такая задача, яна і цяпер не здымаецца, — забяспечыць фармацэўтычную незалежнасць. Ільхам Гейдаравіч пацвердзіў, што гатовы падтрымаць праект будаўніцтва тут вытворчасці медыцынскіх прэпаратаў. Мы гатовы прапанаваць свае тэхналогіі і таксама прайсці гэты шлях, пачынаючы ад расфасоўкі, заканчваючы вытворчасцю лекавых прэпаратаў, якія, зразумела, будзем прадаваць і ў трэціх краінах, выкарыстоўваючы аўтарытэт і ўплыў Прэзідэнта Азербайджана», — сказаў беларускі лідар. Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, Беларусь і Азербайджан таксама дамовіліся і далей развіваць кааперацыйныя сувязі ў прамысловасці. «Мы прайшлі ад зборкі да сумесных прадпрыемстваў і сёння ўжо вырабляем тысячы адзінак тэхнікі», — адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы. Пры гэтым ён падкрэсліў, што ставіцца задача сумесна выходзіць з вырабляемай у Азербайджане прадукцыяй на рынкі трэціх краін.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што развіццё супрацоўніцтва па многіх напрамках было б немагчыма, калі б бакі не ўдзялялі вялікую ўвагу пытанням адукацыі. У гэтым плане кіраўнік беларускай дзяржавы адзначыў, што ў Беларусі цяпер атрымліваюць адукацыю прыкладна паўтары сотні Азербайджанскіх студэнтаў. «Гэтыя спецыялісты кожны год уліваюцца ў народную гаспадарку азербайджана і прыносяць значны вынік. Без гэтага не можа быць нармальнага супрацоўніцтва», — заўважыў беларускі лідар.

Прэзідэнт Беларусі таксама адзначыў, што краіны паспяхова супрацоўнічаюць у культурнай і гуманітарнай сферах. Так, гэтымі днямі ў Мінску адбудзецца прэм'ера балета Кара Караева «Сем прыгажунь».

«Хачу яшчэ раз пацвердзіць, што закрытых тэм у супрацоўніцтве паміж нашымі дзяржавамі няма, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Мы ні ад каго не скрываем, што мы супрацоўнічаем, пачынаючы ад вытворчасці прадуктаў харчавання да пытанняў, якія цікавяць міністэрствы абароны. Мы гэта ні ад каго не скрываем і скрываць не будзем. У нас вельмі даверныя адносіны з Прэзідэнтам Азербайджана, і я ўпэўнены, што такія адносіны будуць паміж нашымі дзяржавамі».

Паводле слоў Прэзідэнта Азербайджана, адносіны з Беларуссю напаўняюцца сур'ёзным зместам і ахопліваюць многія сферы. «Сёння мы абмяркоўвалі важныя пытанні супрацоўніцтва ў сферы адукацыі, гуманітарнага супрацоўніцтва, навукі, высокіх тэхналогій, сельскай гаспадаркі, вытворчасці, ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва, энергетыкі. Толькі пералічэнне гэтых напрамкаў гаворыць само за сябе, і па кожным з іх ёсць добрыя вынікі, ёсць канкрэтныя праекты і праграмы», — адзначыў Ільхам Аліеў.

Бакі на перагаворах дамовіліся нарошчваць намаганні па развіцці супрацоўніцтва ў тых сферах, дзе ўжо ёсць добрыя напрацоўкі, а таксама задзейнічаць новыя перспектыўныя напрамкі. Прэзідэнт Азербайджана канстатаваў, што за апошнія гады двухбаковыя адносіны з Беларуссю прайшлі вялікі шлях і выйшлі на вельмі высокі ўзровень. Краіны актыўна супрацоўнічаюць як у гандлёва-эканамічнай сферы, так і падтрымліваюць адна адну на міжнароднай арэне.

Ільхам Аліеў падкрэсліў, што ўсе прынятыя рашэнні рэалізуюцца ў тэрмін і якасна. «У аснове нашых адносін — вельмі вялікі ўзаемны давер. Нашы словы не разыходзяцца са справамі, а іншы раз нават няма неабходнасці фармалізоўваць нашы дамоўленасці подпісамі. Хоць сёння падпісаны важныя дакументы, якія і далей будуць садзейнічаць збліжэнню нашых краін і народаў», — сказаў Прэзідэнт Азербайджана.

## ЁСЦЬ ФУТРА І ДРОВЫ — ДА ЗІМЫ ГАТОВЫ!



Жыхар вёскі Міхайлаўка Светлагорскага раёна Анатоль Маліноўскі рыхтуецца да зімы.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір МАКЕЙ, міністр замежных спраў:**

*«Палітыка санкцый і ціску завяла адносіны ЕС і Беларусі ў тупік, і аднаўленне адносін магчыма толькі шляхам дыялогу. Не хачу дзяліць дзяржавы ЕС у залежнасці ад іх адносінаў да Беларусі. У нас вельмі добрыя кантакты з шэрагам краін ЕС. Мы хацелі б мець нармальныя палітычныя і эканамічныя кантакты з усімі суседзямі».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 22.11.2013 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 9290,00 | ■ |
| Еўра | 12470,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 281,50 | ▼ |
| Укр. грыўня | 1130,45 | ▼ |

■ Надвор'е

## На выхадныя цёпла, а з панядзелка — амаль зіма

**У бліжэйшыя трое сутак на тэрыторыі Беларусі захаваецца цёплае надвор'е, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Фядотава.**

Таму ў пятніцу на значнай частцы краіны пройдуць невялікія дажджы. Максімальная тэмпература паветра ўдзень плюс 5—10 градусаў. У суботу і нядзелю тэрыторыя нашай краіны застанецца пад уплывам цёплых паветраных мас, аднак у многіх раёнах пройдуць ужо сур'ёзныя дажджы. Уначы і раніцай месцамі туман. Тэмпература паветра на працягу сутак 2—8 цяпла, а ўдзень па поўдні краіны да плюс 10 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, ужо з панядзелка чакаецца рэзкая змена надвор'я з істотным пагаршэннем. Паўночным ветрам на тэрыторыю Беларусі зацягне халоднае арктычнае паветра. Часам будуць ісці ападкі ў выглядзе дажджу з пераходам на снег. Месцамі прагназуецца галалёд, а па паўночным захадзе краіны на дарогах галалёдзіца. Пахаладае. Тэмпература паветра ў панядзелак на працягу сутак будзе вагацца ад мінус 3 да плюс 3 градусаў, уначы па паўночным захадзе — да 5 марозу. А вось у аўторак і сераду надвор'е атрымае ўвогуле зімовы характар. Месцамі будзе ісці снег, часам невялікая мяцеліца, амаль паўсюдна на дарогах галалёдзіца. Уначы падмарозіць ужо да мінус 3-8 градусаў, удзень — ад 0 да мінус 5 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

■ Супрацоўніцтва

## «ХТО Б ШТО НІ КАЗАЎ, МЫ ЖАДАЕМ РАЗВІЦЦЯ НАШЫХ АДНОСІН»

**Турцыя была першай краінай, якая прызнала незалежнасць Рэспублікі Беларусь больш за 20 гадоў таму. Увесь гэты час беларуска-турэцкія адносіны развіваліся па ўсіх накірунках, аднак узаемны інтарэс і магчымасці дзвюх краін значна большыя за іх дасягнуты ўзровень. Таму ад візіту турэцкай парламенцкай дэлегацыі ў Беларусь абодва бакі справядліва чакаюць новага штуршка як у міжпарламенцкіх, так і ў эканамічных адносінах паміж краінамі.**

### ПАДОБНЫХ КАНТАКТАЎ НЕ БЫЛО З 1992 ГОДА

**Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Анатоль РУБІНАЎ,** вітаючы высокіх гасцей у зале верхняй палаты парламента, запэўніў, што беларускі бок вельмі зацікаўлены ў супрацоўніцтве з Турцыяй ва ўсіх сферах.

«Нашы міждзяржаўныя адносіны складваюцца нядрэнна, — сказаў ён. — У сферы эканомікі пакуль што тавараабарот невялікі (набліжаецца да паўмільярда долараў), але ён хутка развіваецца. За 8 гадоў тавараабарот паміж Беларуссю і Турцыяй узрос амаль ў 6,5 раза. Сёлета ён на 30% перавысіў леташні ўзровень. Гэта станоўчая тэндэнцыя.

У нас добрыя палітычныя адносіны. У 2010 годзе наш Прэзідэнт наведваў вашу краіну, сустракаўся з вашым Прэзідэнтам. Быў дасягнуты шэраг дамоў у галіне машынабудаўніцтва, лёгкай прамысловасці, транспарту, іншых кірункаў. Цяпер гэтыя пагадненні выконваюцца»...

Спікер Савета Рэспублікі выказаў задаволенасць і развіццём супрацоўніцтва ў галіне культуры, навукі і адукацыі. Досыць часта адбываюцца кантакты і паміж парламентарыямі абедзвюх краін, аднак на ўзроўні кіраўнікоў парламентаў візітаў не было з 1992 года. «Таму мы асабліва цэнім сённяшні ваш візіт і лічым яго пачаткам новага этапу нашых міжпарламенцкіх адносін,» — падкрэсліў Анатоль Рубінаў.

СТАР. 2

■ Заслужыў — атрымай

## АТЭСТАЦЫЯ ПЕДАГОГАЎ: ЦІ ВАРТА АПУХА КАЖУХА?

**«Днём ісціны» стане 1 верасня 2014 года для педагогаў, якія атрымалі вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю пяць і больш гадоў таму: тыя з іх, хто да гэтага часу не пацвердзіць перад кваліфікацыйнай камісіяй свой «вышэйшы пілатаж» у прафесіі або проста не палічыць неабходным гэта рабіць, будуць «разжалаваны» — да першай кваліфікацыйнай катэгорыі.**

Нагадаем, што крыху больш як год таму пачала дзейнічаць новая інструкцыя аб парадку правядзення атэстацыі педагагічных работнікаў. У Міністэрстве адукацыі, дзе распрацоўваўся гэты дакумент, палічылі, што вышэйшая кваліфікацыйная катэгорыя не можа быць «пажыццёвай узнагародай», а таму кожныя пяць гадоў педагогі павінны свой прафесійны ўзровень пацвярджаць перад «высокай» камісіяй.

Між тым, за год, што дзейнічае новая інструкцыя, акрэсліўся шэраг праблем, якія аказаліся ў цэнтры ўвагі ўдзельнікаў «круглага стала», што прайшоў у Цэнтральным камітэце Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі.

### За што змагаемся?

— Фактычна сёння дзейнічаюць два віды атэстацыі. Першы — на прысваенне кваліфікацыйнай катэгорыі, які існаваў і раней. І ён па-ранейшаму застаецца правам педагога. А вось другі від — на пацвярджэнне вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі раз на пяць гадоў — стаў ужо абавязкам. Праўда, першапачаткова стаяла пытанне аб тым, што і першую, і другую кваліфікацыйную катэгорыі педагогам таксама давядзецца рэгулярна пацвярджаць. Але гэта істотна б пагоршыла прававое становішча большай часткі педагагічных работнікаў, таму мы прапанавалі распаўсюдзіць такі парадак толькі на вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю і кваліфікацыйную катэгорыю «настаўнік-метадыст». І Міністэрства адукацыі прыслухалася да нашай пазіцыі, — падкрэсліў у сваёй прамове **намеснік старшыні галіновага прафсаюза Раман ДАПІРА**. — Наша пазіцыя была наступнай: калі педагагічны работнік абавязкова павінен пацвярджаць кваліфікацыйную катэгорыю, то памер даплаты за яе павінен стымуляваць педагога да павышэння прафесійнага ўзроўню і прысваення яму больш высокай кваліфікацыйнай катэгорыі. Нам было абяцана, што памеры надбавак за кваліфікацыйныя катэгорыі будуць істотна павялічаны, але па сёння даплаты маюць, хутчэй сімвалічны, чым заахвочвальны характар. Праект нарматыўна-прававога акта, які ўстанаўліваў новыя памеры надбавак за кваліфікацыю, быў падрыхтаваны, але ўзгаднення ў аблвыканкамах не атрымаў.

СТАР. 6

## «КОЖНАМУ ТРЭБА ДАЦЬ ШАНЦ...»

**Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Андрэй КАБЯКОЎ падчас працоўнай паездкі ў горад Астравец Гродзенскай вобласці наведаў пляцоўку будаўніцтва Беларускай АЭС і правёў прыём грамадзян па асабістых пытаннях у межах выязной прыёмнай.**

### Вялізная будоўля

Андрэй Кабякоў наведаў пляцоўку, дзе ўжо заліваецца фундамент будучага рэактара АЭС, і ўбачыў, якім чынам ідзе праца. «Будаўніцтва ідзе па графіку, — заявіў ён пасля журналістам. — Нават па некаторых параметрах ёсць апярэджанне. А гэта дае падставу для думкі, што будаўніцтва будзе ісці ў тэрмін». Акрамя таго, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта адзначыў, што на будоўлі пануе найвышэйшая культура вытворчасці і будаўніцтва.

СТАР. 2

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### УКРАІНА ПРЫПЫНІЛА ІНТЭГРАЦЫЮ Ў ЕС



Кабінет міністраў Украіны вырашыў прыпыніць падрыхтоўку да заключэння пагаднення аб асацыяцыі з Еўрасаюзам. Сваё рашэнне кабмін матываваў неабходнасцю развіцця эканамічных адносін з Расіяй і СНД. Акрамя гэтага, кабінет міністраў Украіны даручыў профільным міністэрствам прапанаваць Расіі і ЕС стварыць трохбаковую камісію па пытаннях гандлёва-эканамічных зносін. У сваю чаргу, прэзідэнт Украіны Віктар Януковіч заявіў пасля сустрэчы са сваім аўстрыйскім калегам Хайнцам Фішэрам, што Украіна працягне ісці па шляху еўрапейскай інтэграцыі, нягледзячы на цяжкасці. На пытанне аб тым, калі будзе вызвалена экс-прэм'ер Украіны Юлія Цімашэнка, украінскі прэзідэнт адказаў, што гэта можа быць зроблена толькі ў рамках украінскага заканадаўства.

### ЯПОНІЯ МОЖА ЗНІКНУЦЬ



На думку замежнага выдання Huffington Post Canada, у бліжэйшы час Японія можа быць сцёрта з карты Зямлі. Такі прагноз даў канадска-японскі эксперт па экалогіі Дэвід Судзукі, які апісвае магчымыя наступствы новага землятрусу ў Японіі магнітудай больш за 7 балаў. Эксперт заявіў, што гнятлівы стан атамнай станцыі ў Фукусіме пагражае Японіі страшнай катастрофай. «Чацвёрты рэактар АЭС падвергнуўся настолькі моцным разбурэнням, што ў выпадку новага землятрусу паліўныя стрыжні ўвойдуць у кантакт з навакольным паветрам, і тады Японіі прыйдзе канец, а ўсё насельніцтва заходняга ўзбярэжжа Паўночнай Амерыкі павінна быць эвакуіравана», — цытуюць разважанні спецыяліста СМІ. Вучоны мяркуе, што рызыка ўзнікнення новага штуршка магутнасцю больш за 7 балаў у бліжэйшыя тры гады роўная 95%.

### ВЫЙГРЫШ У 16 МЛН У ЗША НЕ ЗНАЙШОЎ ГАСПАДАРА

У амерыканскім штаце Фларыда невядомы стаў пераможцам латарэі Powerball. Яго выйгрыш — $16 млн. Аднак патэнцыяльны мільянер не з'явіўся, каб забраць свае грошы. Латарэя праводзілася яшчэ ў маі гэтага года, а па яе ўмовах пераможца можа прыйсці па выйгрыш на працягу 180 дзён пасля яе завяршэння. Паведамляецца, што ў Фларыдзе да гэтага часу шукаюць пераможцу. За апошнія 10 гадоў гэта самы вялікі выйгрыш у латарэю, які аказаўся незапатрабаваным.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

## СТРОГІ РЭЖЫМ СНУ — АБАРОНА АД ЛІШНЯЙ ВАГІ

Жанчыны, якія кладуцца і ўстаюць кожны дзень у адзін і той жа час, як правіла, не пакутуюць на атлусценне — такая выснова была зроблена паводле назіранняў спецыялістаў за 300 жанчынамі 17—26 гадоў. Чым больш строга выконваўся рэжым, тым менш было тлушчавых адкладаў.



Раней апублікаваныя даследаванні таксама даказваюць, што недасып адлюстроўваецца на вазе чалавека. Але дагэтуль ніхто не ўлічваў канкрэтны час адыходу да сну. У рамках апошніх пошукаў навукоўцы спачатку ацанілі склад цела добраахвотнікаў. Потым удзельнікам эксперыменту далі прылады, якія адсочваюць іх перамяшчэнне днём і рэжым сну.

Так, калі чалавек спаў менш за 6,5 гадзіны ці звыш 8,5 гадзіны, у яго было больш тлушчавых адкладаў. А калі адрозненні ў часе засынання і пад'ёму складалі 90 хвілін, то канцэнтрацыя тлушчу таксама павышалася, чаго не скажаш пра варыянты, калі розніца ў часе не перавышала 60 хвілін. Прафесар Брус Бэйлі перакананы: рэжым сну ўплывае на гармоны, звязаныя з апетытам. Збіваючы «ўнутраны гадзіннік», чалавек шкодзіць сабе. Каб палепшыць якасць сну, трэба рэгулярна трэніравацца, зрабіць спальню ціхім і цёмным пакоем, а да ложка падыходзіць толькі тады, калі збіраецеся спаць.

КОРАТКА

З пачатку года ў Беларусі дазвол на пастаяннае пражыванне ў рэгіёнах атрымалі 145 замежных грамадзян.

Дні кіно Казахстана пройдуць 25-30 лістапада ў Магілёве. Урачыстае адкрыццё дзён адбудзецца 25 лістапада з удзелам прадстаўнікоў пасольства Рэспублікі Казахстан.

Другі чэмпіянат Беларусі па міні-футболе сярод каталіцкіх святароў пройдзе 25 лістапада ў Лепелі. А ў будучым годзе з 24 па 28 лютага ў Беларусі плануецца правесці восьмы чэмпіянат Еўропы па міні-футболе сярод каталіцкіх святароў.

Шматразовы чэмпіён свету па тайскім боксе Віталь Гуркоў разам з мінскай групай «HandmadE» прыме ўдзел у нацыянальным адборы для конкурсу «Еўрабачанне-2014» з кампазіцыяй «Бег па канатах».

■ Гіпотэзы

## ДА НОВАГА ГОДА СОНЦА ПАМЯНЯЕ ПАЛЯРНАСЦЬ, аднак апакаліпсісу не будзе...



**Па прагнозах навукоўцаў, на працягу бліжэйшых трох-чатырох тыдняў полюсы магнітнага поля Сонца памяняюцца месцамі — а значыць, магнітнае поле «перавернецца». Эксперты пакуль не высветлілі дакладную прычыну такой з'явы, але ўжо могуць, назіраючы за свяцілам, вызначыць момант змены полюсаў. Устаноўлена, што Сонца мяняе месцамі поўдзень і поўнач кожныя 11 гадоў.**

Асобныя астраномы ўпэўнены, што з'ява, якая адбываецца кожныя 11 гадоў, выклікае «хвалевы эфект» па ўсёй Сонечнай сістэме. Гэта можа прывесці да «нараджэння» магутных геамагнітных бур, якія паўплываюць на спадарожнікі і радыёсувязь. Пра гэта ў NASA заяўлялі яшчэ ў жніўні, папярэджваючы, што «пераварот» Сонца варта чакаць у бліжэйшыя тры-чатыры месяцы, але з дакладнай датай не маглі вызначыцца. Цяпер жа гаворыцца пра тое, што змена полюсаў на Сонцы адбудзецца ў бліжэйшыя некалькі тыдняў.

Тут галоўнай прыкметай з'яўляецца тое, што падчас завяршэння 11-гадовага сонечнага цыкла плямы з'яўляюцца на паверхні Сонца каля экватара, дзе адбываецца інтэнсіўная магнітная дзейнасць. За месяц гэтыя плямы распадаюцца, і магнітная актыўнасць мігруе ад экватара да аднаго з полюсаў Сонца, прымушаючы свяціла мяняць палярнасць.

Тод Хоксэм, навуковец з абсерваторыі сонечнай актыўнасці пры Стэнфардскім універсітэце, якая праводзіць маніторынг Сонца з 1975 года, сказаў: «Гэта накшталт механізму прыліву. Кожная маленькая хваля прыносіць трохі больш вады, і ў выніку атрымліваецца поўны разварот».

Філ Шэрар, які працуе з Хоксэмам у абсерваторыі, дадаў: «Паўночны полюс ужо змяніў палярнасць, а паўднёвы толькі наганяе тое, што ўпушчана».

Падчас адной такой магнітнай актыўнасці звычайна адбываецца мноства сонечных выбухаў. Яны могуць уздзейнічаць на магнітнае поле Зямлі, што выклікае магнітныя буры і паўночнае ззянне. Акрамя таго, успышкі могуць парушыць радыёсувязь, пашкодзіць электроніку на спадарожніках і нават уплываць на самалёты, паветраныя трасы якіх праходзяць праз полюсы. Таксама магутныя буры могуць прывесці да адключэння электрычнасці, але, зноў такі, толькі бліжэй да полюсаў.

А вось расійскія спецыялісты ацэньваюць гэтую з'яву трохі інакш. Працэс змены палярнасці сонечнага магнітнага поля будзе працягвацца адзін-два гады, а не тры тыдні, прычым «пераварочванне» поля ніяк не адаб'ецца ні на Зямлі, ні на Сонечнай сістэме ў цэлым, паведаміў **астрафізік Сяргей БАГАЧОЎ з Фізічнага інстытута імя Лебедзева РАН**. Раней астраномы касмічнага агенцтва NASA даведаліся, што неўзабаве на Сонцы адбудзецца «рэвалюцыя», калі магнітнае поле зоркі памяняе палярнасць на супрацьлеглую. Аднак чакаць апакаліпсісу не варта: такія перамены на Сонцы адбываюцца кожныя 11 гадоў. Зрэшты, 11-гадовы цыкл — гэта «сярэдняя тэмпература па шпіталі». На самой справе цыкл можа складаць і 8, і 15 гадоў. У сонечнага «пераварочвання» ёсць і станоўчыя бакі: напрыклад, на Зямлі можна будзе часцей назіраць паўночнае ззянне, адзначаюць навукоўцы.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# «ХТО Б ШТО НІ КАЗАЎ, МЫ ЖАДАЕМ РАЗВІЦЦЯ НАШЫХ АДНОСІН»

## ПАДТРЫМКА ПА БАЛЮЧЫХ ПЫТАННЯХ

Асаблівую падзяку турэцкім калегам за падтрымку на міжнароднай арэне выказаў і **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА**.

— Гэтую падтрымку мы адчулі падчас аднаўлення членства Рэспублікі Беларусь у Парламенцкай асамблеі АБСЕ, пры атрыманні статусу назіральніка ў Парламенцкай асамблеі Чарнаморскага эканамічнага супрацоўніцтва, — адзначыў спікер ніжняй палаты беларускага парламента. — У цэлым, аўтарытэт турэцкіх парламентарыяў у міжнародных парламенцкіх структурах значна вырас. Пацвярджэннем таму абранне ў 2010 — 2012 гадах дэпутата ад Турэцкай Рэспублікі Меўлюта Чавушаглу старшынёй Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы. Ён вельмі актыўна працаваў у гэтай парламенцкай арганізацыі і зрабіў шмат крокаў насустрач Рэспубліцы Беларусь.

Уладзімір Андрэйчанка таксама падзякаваў удзельнікам турэцкай дэлегацыі за ўвагу, якая была аказана беларусам падчас XXII сесіі Парламенцкай асамблеі АБСЕ, якая нядаўна праходзіла ў Стамбуле. Тады быў устаноўлены добры кантакт паміж беларускімі і турэцкімі парламентарыямі і была аказана ўзаемная падтрымка па балючых для абедзвюх краін пытаннях.

Падчас сустрэчы ў Савеце Рэспублікі 20 лістапада кіраўнікі парламентаў Беларусі і Турцыі падпісалі пратакол аб міжпарламенцкім супрацоўніцтве.

## БАЧЫЦЬ АБ'ЕКТЫЎНА

**Старшыня Вялікага нацыянальнага сходу Турэцкай Рэспублікі Джаміль ЧЫЧЭК** пагадзіўся, што паміж Беларуссю і Турцыяй няма палітычных праблем і існуе спрыяльная атмасфера для далейшага развіцця адносін ва ўсіх сферах, а міжпарламенцкае супрацоўніцтва неабходна актывізаваць. «Думаю, што пасля гэтага візіту ў нас будзе магчымасць навярстаць упушчанае», — запэўніў кіраўнік дэлегацыі.

— Некаторыя краіны не зусім верна расцэньваюць вашу краіну, але мы лічым, што мы правільна яе бачым, — дадаў Джаміль Чычэк. — Таму, хто б што ні казаў, мы жадаем развіцця нашых адносін. Для гэтага ёсць магчымасці, і ў першую чаргу ў развіцці эканамічных адносін. Патэнцыял кожнай з нашых краін у гэтай сферы значна большы за той, які ёсць зараз. Зараз шмат сумесных праектаў, якія можна выконваць. Самы дзейсны механізм для гэтага — Міжурадавая камісія па эканамічным супрацоўніцтве.

Турцыя мае багаты досвед у эканамічным развіцці, якім гатова падзяліцца з Беларуссю, паведаміў спікер турэцкага парламента. Яна гэтак жа, як і Беларусь, выдаткоўвае шмат сродкаў на імпарт энергетычных рэсурсаў і шмат працуе над тым, каб павялічваць экспарт. Пры гэтым многія праекты ў Турцыі выконваюцца з дапамогай інвестыцый, якія ажыццяўляе прыватны сектар.

— Прыватныя турэцкія кампаніі набылі значны досвед у сваёй працы, і некаторыя з іх гатовы працаваць у Беларусі, — дадаў Джаміль Чычэк. — Нам хацелася б, каб больш турэцкіх кампаній працавала тут. Для таго, каб ажыццяўлялася больш замежных інвестыцый у эканоміку Беларусі, важна забяспечыць інвестараў бяспечнымі ўмовамі работы і найменшай колькасцю бюракратычных працэдур.

## УРАД ПААБЯЦАЎ СТВАРЫЦЬ УМОВЫ

На наступны дзень, 21 лістапада, турэцкая парламенцкая дэлегацыя сустрэлася з **Прэм'ер-міністрам Рэспублікі Беларусь Міхаілам МЯСНІКОВІЧАМ**, які падтрымаў ініцыятыву турэцкага боку па абнаўленні дамовы пра ўзаемнае садзейнічанне і ўзаемную абарону інвестыцый.

«З моманту падпісання дамовы прайшло амаль 20 гадоў. Думаю, трэба актуалізаваць гэты базавы дакумент эканамічнага супрацоўніцтва, — сказаў кіраўнік беларускага ўрада. — За апошнія 5 гадоў аб'ём турэцкіх інвестыцый у Беларусь вырас амаль у 11 разоў. За 9 месяцаў гэтага года прамыя турэцкія інвестыцыі склалі $37,5 млн. Думаю, можна было б і больш. А мы, са свайго боку, будзем ствараць найлепшыя ўмовы для турэцкіх інвестараў. Вы ўмееце працаваць з інвестыцыямі».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

*Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.*

# «КОЖНАМУ ТРЭБА ДАЦЬ ШАНЦ...»

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

«Увогуле гэта грандыёзная будоўля. І асабліва радуе, што практычна ўсё (прынамсі на гэтым этапе) будуецца з беларускіх матэрыялаў — арматура, цэмент, пясок і іншае. І будуецца ўсё рукамі беларускіх будаўнікоў, хоць дапамога расійскіх калег адчуваецца. Гэта вялізная беларуская будоўля, якая вырашае найважнейшую задачу забеспячэння энергетычнай бяспекі краіны. Акрамя таго, яна навучае нашых будаўнікоў», — падкрэсліў Андрэй Кабякоў.



Фота БЕЛТА.

### Ішлі з асаблівымі праблемамі

Насамрэч падчас прыёму кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта выслухаў розныя надзённыя і нават глабальныя пытанні. Так, адна жанчына прыйшла папрасіць дапамогі для сваёй унучкі, якой зрабілі некалькі складаных аперацый. Але гэта не ўсё: патрэбны яшчэ. І Андрэй Кабякоў абяцаў паспрыяць вырашэнню гэтага пытання.

Выказаў сваю крыўду былы работнік райвыканкама, які потым пайшоў працаваць на атамную станцыю. Пасля амаль паўтарагадовай працы яго прымусілі перайсці на рабочую пасаду замест кіраўніцкай. Гэтае спрэчнае пытанне таксама было занатавана Андрэем Кабяковым.

Цікавым, на маю думку, быў выпадак аднаго паляка-ксяндза, які пражыў у нашай краіне больш за дваццаць гадоў і хоча, па яго словах, «тут і памерці». Але гэтаму чалавеку, колькі разоў ні звяртаецца, не даюць пасведчанне на права жыхарства. Не грамадзянства, а толькі пасведчання на права жыхарства. Што вельмі здзівіла кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта. Ён даручыў разабрацца з гэтай праблемай.

Найбольш дыскусійным стаў разгляд звароту маці двух дзяцей. Яна скардзілася на тое, што ёй ніяк не могуць даць якога-небудзь жылля. Пакуль што яна жыве ў чужым доме. «Я рады, што яна ўзялася за галаву і гадуе дзяцей, — адзначыў Адам Кавалька, старшыня Астравецкага раённага выканаўчага камітэта. — Мы прапануем ёй у аграгарадку нармальны дом двухкватэрны, працу. Дзіцячы садок ёсць. У школу можна будзе ездзіць». Аднак з працаўладкаваннем у жанчыны ўзніклі праблемы: даяркай ісці не можа, бо дзяцей зранку няма з кім пакінуць, а іншай працы няма. «Яна вучылася ў тэхнікуме, праз год загуляла. Потым паступова вярнулася да нармальнага жыцця, — расказвае старшыня райвыканкама. — Галоўнае, што мы дзяцей у яе не забралі. Аднак кіраўнікі ў яе не вераць і нават пасля маіх просьбаў не вельмі спяшаюцца браць яе на працу». Андрэй Кабякоў адказаў на гэта наступнае: «Не трэба ўспамінаць тое, што было. Кожнаму павінен быць дадзены шанц. Я бачу маці двух дзяцей, грамадзянку Рэспублікі Беларусь, якая хоча працаваць і гадаваць іх. Мы любому павінны даць працу і магчымасць выхавання дзяцей».

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ,** *г. Астравец.*

■ Факт

## САРДЭЧНАЯ «НАСТРОЙКА»

**У Гродзенскім абласным кардыялагічным цэнтры праведзена першая аперацыя па лячэнні цяжкіх парушэнняў рытму і праводнасці сэрца з дапамогай імплантацыі рэсінхранізуючых устройстваў.**

Аперацыя пацыенту, які пакутаваў ад сур'ёзнай арытміі сэрца, прайшла паспяхова: частата сардэчных скарачэнняў і ціск цяпер у норме.

Гродзеншчына стала адным з першых рэгіёнаў краіны, дзе, акрамя сталіцы, асвоены новы від кардыялагічнай дапамогі. Для гэтага абласны кардыяцэнтр аснашчаны самай сучаснай медыцынскай тэхнікай. Ёсць усё неабходнае і для спецыяльнага праграмавання прыбораў сардэчнай рэсінхранізацыі з улікам індывідуальных асаблівасцяў кожнага пацыента, і непасрэдна для хірургічных умяшанняў. Дарэчы, падчас першай для гродзенскай кардыяхірургіі аперацыі хірургу-арытмолагу Паўлу Мацвяенку дапамагаў калега з РНПЦ «Кардыялогія» Алег Каваленка. А ў далейшым гродзенскія спецыялісты будуць працаваць самастойна.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

НАВІНЫ

## ПЛІТЫ З ДРАЎНЯНАГА ВАЛАКНА БУДУЦЬ ВЫРАБЛЯЦЬ У МАЗЫРЫ

**Пераносаў тэрмінаў уводу новых аб'ектаў на прадпрыемствах дрэваапрацоўчай галіны Беларусі больш не будзе. У тым ліку на Мазырскім дрэваапрацоўчым камбінаце павінны ўвесці ў строй вытворчасць цеплаізаляцыйных пліт з драўнянага валакна ў першым квартале наступнага года. Менавіта пра гэта ішла гаворка на пасяджэнні міжведамаснай рабочай групы па праверцы выканання праграмы мадэрнізацыі дрэваапрацоўчай галіны ў Мазыры.**

Па словах спецыялістаў, нізкі тэмп мадэрнізацыі звязаны з пралікамі кіраўніцтва прадпрыемства пры распрацоўцы першапачатковага варыянта бізнес-плана і невыкананнем дагаворных абавязацельстваў па пастаўцы асноўнага тэхналагічнага абсталявання. Была агучана вялікая колькасць прэтэнзій да партнёраў з Германіі і Італіі. Аднак **старшыня Камітэта дзяржкантролю Аляксандр ЯКАБСОН** не атрымаў адказу на пытанне аб тым, якім санкцыям падверглiся замежныя фірмы за парушэнне ўмоў паставак абсталявання. Члены міжведамаснай рабочай групы будуць дасканала вывучаць гэтае пытанне. Між тым, у Мазыры, па сутнасці, будуецца новы завод, падкрэсліў значнасць прадпрыемства для ўсёй краіны Аляксандр Якабсон:

— Я лічу, што гэта самы цікавы праект у рэспубліцы. Такіх прадпрыемстваў няма ні ў адной краіне СНД і вельмі мала ў Еўропе. Матэрыял, які тут прадстаўлены, — гэта прагрэсіўны і цікавы прадукт. Самае цікавае, што пры выхадзе на поўную магутнасць гэтага прадпрыемства выручка вырасце амаль у 10 разоў у параўнанні з сённяшняй.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## «ЧЭМПІЁН СМАКУ» З МАЛАДЗЕЧНА

**У лістападзе ў Мінску прайшоў народны конкурс-дэгустацыя «Чэмпіён смаку», які арганізавала сталічнае таварыства спажыўцоў. Ацэнку прадукцыі айчыннага харчпрама далі эксперты і простыя спажыўцы.**

Званне «Чэмпіён смаку» ў намінацыі «Спажывецкая ацэнка-якасць» быў удастоены Маладзечанскі малочны камбінат. Ён жа стаў уладальнікам Гран-пры за мяккі сыр «Мацарэла» (з масавай доляй тлушчу 45%).

У цэлым, Маладзечанскі малочны камбінат, як паведаміла карэспандэнту «Звязды» **начальнік аддзела забеспячэння і маркетынгу прадпрыемства Анжэла ШАБУНЯ**, увайшоў у дзясятку прадпрыемстваў Беларусі, якія валодаюць найбольшай колькасцю Гран-пры па выніках 2013 года ў конкурсе-дэгустацыі «Чэмпіён смаку», і стаў лідарам спажывецкіх пераваг.

**Святлана БУСЬКО.**

ПАДЗЕІ

## ЗАГІНУЛІ ПАСЛЯ ВЯСЕЛЛЯ...

**Жудасная трагедыя адбылася ўвечары на трасе Мінск — Віцебск: паблізу Лагойска ў дарожна-транспартным здарэнні загінула маладая пара, у якой толькі-толькі прайшло вяселле. І юнак, і дзяўчына былі 1990 года нараджэння...**

Як паведамілі ва УДАІ МУС, на 44-м кіламетры аўтадарогі ў 19.40 жыхар Ваўкавыскага раёна, кіруючы аўтамабілем «Сітраен», пры здзяйсненні абгону іншага легкавіка, які рухаўся ў спадарожным напрамку, не пераканаўся ў бяспецы манеўра: па сустрэчнай паласе рухалася фура. Сутыкнення з паўпрычэпам грузавіка «Мерседэс», які спрабаваў збочыць, пазбегнуць не ўдалося... Ад удару «Сітраен» развярнула на паласе сустрэчнага руху, пасля чаго адбылося яшчэ адно сутыкненне — з фурай «Сканія». У выніку кіроўца і ехаўшая з ім равесніца-жонка, 23-гадовая дзяўчына з Баранавічаў, ад атрыманых траўмаў загінулі на месцы...

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ЗАКОН ПАРНЫХ ВЫПАДКАЎ?

На тэрыторыі аднаго з мазырскіх прыватных прадпрыемстваў рабочыя разгружалі драўляныя кантэйнеры са шклом. Адзін з іх, памерам 2x3 м і вагой у 1 тону, абваліўся з машыны на 23-гадовага рабочага. Урачы «хуткай» канстатавалі смерць маладога мужчыны.

Высветлілася што амаль адначасова на прадпрыемстве «Гомельшкло» ў Касцюкоўцы пры аналагічных абставінах загінуў яшчэ адзін чалавек, 50-гадовы мужчына: на яго таксама па нейкай прычыне абрынулася шкло.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

ФАКТЫ

## ЗА 10 МЕСЯЦАЎ ПАБУДАВАНА КАЛЯ 50 ТЫСЯЧ КВАТЭР

**Сёлета ў студзені—кастрычніку арганізацыямі ўсіх формаў уласнасці пабудавана 49,3 тысячы новых кватэр (у студзені—кастрычніку летась — 45 тысяч). Уведзена ў эксплуатацыю 4 млн 176,5 тысячы квадратных метраў агульнай плошчы жылля, што складае 64,3% да прадугледжанага задання на год і 114,2% да ўзроўню адпаведнага перыяду летась.**

Для грамадзян, якія стаяць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, уведзена ў эксплуатацыю 2 млн 220,8 тысячы квадратных метраў агульнай плошчы, або 53,2% ад агульнага аб'ёму ўведзенага жылля. У параўнанні са студзенем—кастрычнікам летась увод у эксплуатацыю жылля для гэтай катэгорыі грамадзян павялічыўся на 126,3 тысячы квадратных метраў. З агульнага аб'ёму ўведзенага жылля для жыллёвых чаргавікоў пабудавана з выкарыстаннем дзяржаўнай падтрымкі 1 млн 952,1 тысячы квадратных метраў, у шматкватэрных жылых дамах у гарадах — 1 млн 498,4 тысячы «квадратаў».

**Сяргей КУРКАЧ.**


ПРОДАЕТСЯ
бизнес-центр
Кристалл,
9 030 м²
Офисные, торговые, производственные, складские помещения.
Удобное расположение
г. Гомель, ул. Ильича, 331-2
Рассрочка. Тел. (029) 195 56 81.
УНП 100080849


# ЯКІЯ РАБОТЫ Ў ПАД'ЕЗДЗЕ ВЫКОНВАЕ ЖЭС, А ЯКІЯ — САМІ ЖЫЛЬЦЫ?

**У рэдакцыю патэлефанаваў наш чытач Вячаслаў Пісарык са Слуцка і паскардзіўся, што ў іх над пад'ездам ёсць ліхтар, але ў ім няма лямпачкі. І што нагадваць ЖЭСу, каб укруцілі ў ліхтар лямпачку, трэба па 2—3 месяцы! То ў ЖЭСа няма вышкі, то няма лямпачак... А між тым каля пад'езда вечарамі пануе несусветная цемра. Ці нармальнае такое становішча спраў? — цікавіцца чытач.**

Вядома ж, не. Дарэчы, ліхтар над пад'ездам Вячаслава Васільевіча загарэўся на наступны ж дзень пасля яго званка ў рэдакцыю. Ну, а мы вырашылі даведацца ў спецыялістаў, якія работы ў пад'ездзе і ў які тэрмін павінен выконваць ЖЭС, а якія — самі жыльцы.

Пра гэта мы запыталіся ў **намесніка дырэктара ЖРЭА Цэнтральнага раёна г. Мінска па добраўпарадкаванні Таццяны НЕСЦЯРОВІЧ**:

— ЖЭС павінен ажыццяўляць мыццё вокнаў — 1 раз у год, мыццё пад'езда — 2 разы на месяц, падмятанне пад'езда штодня.

Жыльцы, са свайго боку, павінны падтрымаць парадак, не засмечваць пад'езд (мы прыбіраем так званае выпадковае смецце), не павінны пускаць туды старонніх, асабліва асоб без пэўнага месца жыхарства.

Мы стараемся прыбіраць усе пад'езды, — адзначыла Таццяна Несцяровіч. — Але калі на нейкім участку няма прыбіральшчыцы, то мы на экране якасці, які штодня вядзецца па кожным доме і кожным пад'ездзе, адзначаем працу як нявыкананую або выкананую няякасна. Жыльцы ў нас аплачваюць камунальныя паслугі толькі на 24%, таму мы здымаем аплату за нявыкананую працу не з іх, а з бюджэту — ці, іншымі словамі, не бяром за гэтую працу грошай з бюджэту горада.

А вось што адказаў на наша пытанне **намеснік дырэктара ЖРЭА Цэнтральнага раёна г. Мінска па вытворчасці Аляксей СОБАЛЬ**:

ЖЭС ажыццяўляе замену лямпачак у пад'ездзе. Прычым такая заяўка павінна быць выканана на працягу працоўнага дня, або, як мы кажам, «дзень у дзень». Таксама мы выконваем нейкія дробныя работы — напрыклад, рамантуем уваход у пад'езд, калі яго заліла. Што тычыцца рамонту пад'езда, то, згодна з новым Жыллёвым кодэксам, ён ажыццяўляецца з долевым удзелам жыльцоў. Гэта значыць, што на агульным сходзе жыльцоў усе запаўняюць апытальны ліст, і калі 50% ці больш галасуюць «за», то прызначаецца старэйшы па пад'ездзе, з якім ЖЭС у далейшым вядзе дыялог. Менавіта са старэйшым па пад'ездзе ўзгадняецца аб'ём работ, якая будзе выбрана фарба, яе колер і г.д. Затым робіцца рамонт, а выдаткі на яго дзеляцца на ўсіх пароўну і выстаўляюцца ў жыроўках пакватэрна.

**Святлана БУСЬКО.**

■ Тэорыя і практыка

# У ВАС ЁСЦЬ СМЕЛЫЯ ІДЭІ?

**Тэхнапарк для іх рэалізацыі ствараецца ў Брэсце. Аб гэтым паведаміў губернатар Канстанцін СУМАР на сустрэчы ў Палескім універсітэце.**

Кіраўнік вобласці азнаёміўся з умовамі вучобы і пражывання студэнтаў, абмяняўся думкамі з моладдзю і выкладчыкамі па актуальных праблемах адукацыі. А перад гэтым прачытаў грунтоўную лекцыю. У сваёй лекцыі Канстанцін Сумар даў кароткі аналіз стану эканомікі вобласці. Пры гэтым падкрэсліў, што галоўнай задачай усіх эканамічных і вытворчых намаганняў становіцца павышэнне якасці жыцця нашых людзей і стварэнне такіх умоў, пры якіх жыць і працаваць на Брэстчыне было б прэстыжна і камфортна. А інтэлектуальны і навуковы патэнцыял усіх чатырох ВНУ якраз і павінен паспрыяць эфектыўнаму развіццю вобласці і яе рэгіёнаў.

Губернатар закрануў работу Міжуніверсітэцкага савета, які быў створаны некалькі гадоў таму. Яшчэ падчас сустрэчы ў Брэсцкім тэхнічным універсітэце кіраўнік вобласці прапанаваў вучоным займець «задачнік», складзены прадпрыемствамі і арганізацыямі вобласці па найбольш актуальных праблемах дня сённяшняга і на перспектыву. Было адзначана, што такі «задачнік», хоць і не поўнасцю, але сфарміраваны. Навуковага падыходу патрабуюць праграмы развіцця прамысловасці, гандлю, сельскай гаспадаркі, энергазберажэння, прыродакарыстання, турызму і многага іншага.

І на гэтым шляху навука ВНУ павінна цесна ўзаемадзейнічаць з прадпрыемствамі. Удалым прыкладам можа служыць філіял у Парку высокіх тэхналогій, які адкрывае Брэсцкі ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна. Вельмі важна, што на базе філіяла будзе арганізавана практыка студэнтаў, дзе яны атрымаюць першы прафесійны вопыт. Ёсць дастойныя напрацоўкі і ў другіх установах рэгіёна. У тэхнічным універсітэце на этапе ўкаранення знаходзіцца праект, які дазваляе прагназаваць паводкі, што надзвычай актуальна для Палесся. Своечасова атрыманая інфармацыя аб магчымай крытычнай сітуацыі дазволіць мінімізаваць негатыўныя наступствы. У Баранавіцкім універсітэце ажыццёўлены праект па вырабе нажоў для здрабнення шчапы. Вытворчыя выпрабаванні праводзіліся на прадпрыемствах «Лагуна», «Баранавічыдрэў». У выніку ўкаранення тэхналогіі на прадпрыемствах атрыманы эканамічны эфект каля 140 мільёнаў рублёў. Турыстычны маршрут «Заказнік Сярэдняя Прыпяць», які распрацавалі спецыялісты БрДУ імя А.С. Пушкіна, ужо прымае турыстаў. Спіс можна доўжыць.

У плане навукова-даследчай і інавацыйнай дзейнасці губернатар вылучыў Палескі ўніверсітэт. Вучонымі ўстановы праведзена даследаванне асноў эканамічнага механізму, здольнага забяспечыць устойлівае функцыянаванне прамысловага і аграпрамысловага комплексаў рэгіёна. Імі праведзена комплексная ацэнка сельскіх тэрыторый і выпрацаваны рэкамендацыі па найлепшых месцах для агратурызму. Тут створаны навуковыя работы па вытворчасці таварнай рыбы ў невялікіх вадаёмах і сістэме кармлення асятровых рыб. Распрацоўкі біятэхналагічнага факультэта знайшлі ўкараненне ў чатырох фермерскіх гаспадарках, рыбгасах «Палессе» і «Сялец». Пры навучальнай установе створана прадпрыемства «Плантарум», якое з'яўляецца першым рэзідэнтам Тэхнапарка «Палессе». Толькі за 9 месяцаў гэтага года прадпрыемства прадало атрыманыя з дапамогай ДНК-тэхналогій саджанцы буякоў на суму больш за 150 мільёнаў рублёў. Нядрэннымі заробкамі можа пахваліцца і цэнтр турызму Палескага ўніверсітэта. Такім чынам, на думку кіраўніка вобласці, самы малады ўніверсітэт паказвае прыклад, як зарабляць грошы на навуцы з карысцю для сябе і для рэгіёна.

Губернатар паведаміў прысутным, што ў Брэсце на былых плошчах электрамеханічнага завода ствараецца навукова-тэхнічны парк. Яго ідэя заключаецца ў тым, каб пад адным дахам аб'яднаць інавацыйныя прадпрыемствы і даць магчымасць маладым вынаходнікам апрабаваць свае праекты. У тэхнапарку стане магчымым рэалізаваць многія распрацоўкі, якія нараджаюцца ва ўніверсітэцкіх сценах, але застаюцца на паперы з-за адсутнасці тэхнічных альбо фінансавых магчымасцяў. Рэзідэнты тэхнапарка атрымаюць падатковыя льготы да трох гадоў, для іх будзе зніжана арэндная плата. Гэта цудоўная магчымасць злучыць навуковы патэнцыял ВНУ з патрэбамі вытворчасці.

У кожнай з чатырох вышэйшых навучальных устаноў вобласці ёсць што прапанаваць новаму тэхнапарку. Літаральна нядаўна на конкурсе, які праводзіўся Беларускім фондам фундаментальных даследаванняў, перамаглі два праекты Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта, якія выкананы ў сферы жыллёвага будаўніцтва і рыбнай гаспадаркі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ**

■

■ Факт і каментарый

# ПАВЯРНУЦЬ МІГРАЦЫЙНЫ ПАТОК

**З пачатку года, па афіцыйнай інфармацыі, больш як 5 тысяч беларусаў з'ехалі на заробкі ў іншыя краіны. Аднак рэальная лічба можа быць значна вышэй. Дакладную колькасць працоўных мігрантаў назваць складана. Напрыклад, дагавор паміж Беларуссю і Расіяй аб роўных правах грамадзян дазваляе беларусам працаваць у суседняй краіне без інфармавання аб гэтым спецыяльных органаў — гэта значыць, проста па працоўным дагаворы. І многія там уладкоўваюцца на працу нелегальна.**

Паводле статыстыкі па далёкім замежжы, больш за ўсё беларусаў выязджае працаваць у Германію (16,5%), ЗША (9,8%), Турцыю (9,1%), Вялікабрытанію (8,7%) і Італію (8,1%). Усяго ж нашы грамадзяне працуюць у 84 краінах. Нават такіх экзатычных, як Емен, Эквадор, Балівія, Катар, Малайзія, Камбоджа, В'етнам.

У большасці выпадкаў жыхары Беларусі выязджаюць за мяжу на сезонныя работы. Колькасць працоўных кантрактаў, заключаных на тэрмін ад аднаго да трох месяцаў, склала 63,3%, ад трох да шасці месяцаў — 15,8%. Прычыны, якія ўказвалі маладыя людзі, былі наступныя: незадаволенасць матэрыяльным становішчам і адсутнасць упадабанай працы. Што пра гэта думаюць і якое выйсце з гэтай сітуацыі бачаць заканадаўцы? Пра гэта мы спыталі **намесніка старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах Ганну ЛЯВІЦКУЮ**:

— Сёння Беларусь, як і іншыя краіны свету, актыўна ўдзельнічае ў працэсе экспарту і імпарту працоўнай сілы. Яна з'яўляецца і «донарам», і рэцыпіентам, а таксама дзяржавай, праз якую актыўна ідуць міграцыйныя патокі. Гэта нармальны працэс, што зараз у многіх краінах постсавецкай прасторы назіраюцца міграцыйныя патокі, асабліва сярод маладога насельніцтва, з мэтай паляпшэння матэрыяльнага дабрабыту, фінансавага палажэння. У 2012 годзе, па афіцыйных крыніцах, на пастаяннае пражыванне ў нашу краіну прыехала каля 18 000 іншаземцаў, а выехала толькі каля 9 000. Гэта значыць, сальда ў нас станоўчае. Асноўны іміграцыйны паток назіраецца з краін СНД, у тым ліку з Расіі, Украіны, на долю якіх прыходзіцца больш як 80% ад агульнай колькасці прыезджых.

З Расіі да нас прыязджаюць у асноўным людзі, якія займаюць тут кіруючыя пасады для рэалізацыі істотных праектаў, з Украіны, Малдовы, Узбекістана — часцей будаўнікі, прадстаўнікі сельскагаспадарчай галіны. Але для нас, як і для любой краіны, больш цікавыя людзі з высокім інтэлектуальным патэнцыялам, якія прыносяць свае веды, досвед.

Мы вельмі хацелі б, каб Беларусь з краіны, якая экспартуе працоўныя рэсурсы, ператварылася ў тую, якая імпартуе. Калі казаць пра заканадаўчае рэгуляванне ў гэтай сферы, то ў нашай краіне прымаецца шмат праграм, якія накіраваны на тое, каб сацыяльна абараніць моладзь. Тым не менш, ёсць неабходнасць разгледзець падыходы да паляпшэння сацыяльнага пакета, працаўладкавання, асабліва выпускнікоў ВНУ. Неабходна вярнуцца да прадастаўлення некаторых матэрыяльных ільгот — напрыклад, на пабудову жылля. Гэтае пытанне — самае цяжкае, але вырашыць яго неабходна: маладыя людзі хочуць мець сваё ўласнае жыллё, жыць без бацькоў і быць незалежнымі. Магчыма, трэба больш дэталёва разгледзець здольнасць дзяржавы на падобныя льготы.

Варта больш актыўна працаваць з перспектыўнай моладдзю. Ужо пры атрыманні сярэдняй адукацыі дапамагаць маладому чалавеку сарыентавацца ў выбары прафесіі. Не сакрэт, што многія сёння ідуць у ВНУ для атрымання вышэйшай адукацыі нават тады, калі спецыяльнасць не зусім падабаецца.

Неабходна і Міністэрству працы і сацыяльнай абароны, і Міністэрству адукацыі выхоўваць тыя працоўныя кадры, якія будуць запатрабаваны ў нашай краіне на рынку працы. Была сітуацыя з празмернай колькасцю ў нас бухгалтараў, эканамістаў...

Маладым людзям трэба разумець: неабходна вярнуць дзяржаве тое, што яна табе дала. Атрыманне адукацыі ў школе бюджэтнае. Калі ў цябе ёсць веды, то можна паступіць на бюджэт і ў ВНУ. І абавязак кожнага маладога чалавека — адпрацаваць гэтыя інвестыцыі сумленна. Усім адразу хочацца вялікіх заробкаў, але грошы плацяць у тым ліку і за вопытнасць. Юнацкі максімалізм многім шкодзіць. Неабходны рацыянальны падыход да справы.

Дзяржаве таксама не пашкодзіла б палепшыць патрыятычнае выхаванне, бо мы на нейкім пэўным этапе развіцця нашай краіны пераарыентаваліся з духоўных каштоўнасцяў на матэрыяльныя, і я асцерагаюся, што вельмі хутка мы не будзем нічога цаніць, акрамя фінансавага палажэння.

Нашай дзяржавай прымаецца шмат намаганняў па паляпшэнні дэмаграфічнай сітуацыі, у тым ліку па прадастаўленні грамадзянам сацыяльнага пакета. Аднак трэба разумець, што маштабнасць гэтых ільгот поўнасцю залежыць ад вынікаў эканомікі.

**Крысціна ПЯСЕЦКАЯ.**

### *Дарэчы*

*Як паведаміў учора ў Мінску начальнік дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі МУС Аляксей Бягун, за мяжой сёння працуюць прыкладна 300 тысяч беларусаў. Паводле яго слоў, такія лічбы заснаваны на навуковых даследаваннях, абследаваннях хатніх гаспадарак. Дакладнай інфармацыі па гэтай праблематыцы няма, прызнаў ён.*

*«Калі гаварыць наогул пра колькасць грамадзян Беларусі, якія знаходзяцца за межамі краіны і ажыццяўляюць там працоўную дзейнасць, то мы гаворым, хутчэй за ўсё, пра лічбу ў 300 тысяч. Лічба вагаецца з-за прыблізнага аналізу», — сказаў прадстаўнік МУС.*

■


**ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ**
**ЗАО «Белкоммунстроймонтаж»,**
*опубликованной в газете «Звязда» 26.01.2013 г. № 16*
**строительства 20-этажного односекционного жилого дома со встроенно-пристроенными помещениями общественного назначения и гараж-стоянкой открытого типа в границах ул. Каховская – Оршанская – Орловская – Сморговский тракт, г. Минск:**

Для привлечения к строительству по договору создания объекта долевого строительства предлагаются 3 (три) парковочных места в паркинге открытого типа по 30 000 (тридцать тысяч) долларов США при первоначальном взносе 50%.

**Дополнительную информацию можно получить по адресу: г. Минск, ул. Немига, 40, офис 704. Тел. 8 (017) 306 20 90, или у уполномоченных риэлторов (агентств недвижимости).**
УНП 101019973



**ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ**
**Иностранное общество с ограниченной ответственностью «Датч Стар»,**
*опубликованной в газете «Звязда» 26.09.2013 г. № 181*
**«Многоквартирный жилой дом с подземной гараж-стоянкой (№ 1 по генплану в квартале пр. Дзержинского – ул. Щорса – ул. Железнодорожная – ул. Хмелевского) со встроенно-пристроенными объектами обслуживания населения» 1-я очередь**

Для привлечения к строительству по договору создания объекта долевого строительства предлагаются нежилые помещения на 2-м этаже: стоимость 1 кв.м 1800 (тысяча восемьсот) долларов США при 100% первоначальном взносе, 1900 (тысяча девятьсот) долларов США при 50% первоначальном взносе, 2000 (две тысячи) долларов США при 30% первоначальном взносе.

**Дополнительную информацию можно получить по адресу: г. Минск, ул. Немига, 40, офис 704. Тел. 8 (017) 306 20 90, или у уполномоченных риэлторов (агентств недвижимости).**
УНП 191061436

ТВ@Р

Вольга БУРЛАКОВА:

# «ПРАФЕСІЯ ТЭЛЕВЯДУЧАЙ — РОЛЯ, З ЯКОЙ Я СПРАВІЛАСЯ»

**Яе характарызуюць працавітасць, пачуццё справядлівасці і неабыякавасць па жыцці. На экране яна, як універсальны салдат, іграе станоўчых і адмоўных герояў, з лёгкасцю прымярае на сябе новыя прафесіі. Любіць прафесіяналаў і з гордасцю адзначае, што не саромеецца ніводнай сваёй ролі. Аўдыторыя ведае Вольгу Бурлакову не толькі як актрысу тэатра і кіно, але і як вядучую «Раніца. Студыя добрага настрою» на канале СТБ. Пры сустрэчы мы пагаварылі з ёй пра бліжэйшыя змены ў эфіры, цікавыя сцэнарыі фільмаў і пачуццё адказнасці.**



**— Якіх перамен чакаць прыхільнікам «Раніца. Студыя добрага настрою» ў новым сезоне?**

— Галоўнае — будзем рабіць усё, каб раніца з нашай праграмай была лепшай у краіне. Мы пачнём працаваць у новай студыі, дзе тэхнічныя магчымасці зусім іншыя. І гэта не можа не радаваць. З'явіцца больш гасцей. Раней нашы ўмовы не заўсёды дазвалялі запрасіць, напрыклад, нейкі калектыў, якому патрабавалася прастора для дзейнасці. Спадзяёмся, што пашырэнне тэрыторыі і з'яўленне ўнікальных тэхнічных навінак дазволіць нам развярнуцца ў эфіры. «Залаты» састаў вядучых і фармат самой праграмы застануцца ранейшымі. Аднак больш фарбаў, больш пазітыву — пачнём новае жыццё ў «Студыі добрага настрою».

Вельмі хацелася б, каб яно пачалося ў навагоднія святы. Хочацца верыць, з тэрмінамі мы паспеем і наша праграма выйдзе да канца года на хвалі святочнага настрою і феерыі.

**— У праграме вас можна было ўбачыць не толькі ў студыі, але і ў рубрыцы, дзе вы асвойваеце новыя прафесіі. Ваша ўласная ідэя?**

— Так, мне як вядучай не хапала нечага ў эфіры, таму я прапанавала сваю ідэю. Вырашыла паездзіць, пазнаёміцца з людзьмі, прымяраючы на сябе іх прафесіі. У рэальнасці ўсё аказалася не так проста, як падавалася на першы погляд. Калі прыязджаеш на месца здымак, нават маючы нейкае ўяўленне пра занятак чалавека, то аказваецца, што ты не ведаеш амаль нічога. А табе трэба не толькі расказаць пра яго гледачу ў даступнай форме, але яшчэ і ўкласціся ў кароткі адрэзак часу. Заўсёды прыемна ўражвалі людзі, якіх мне выдзялялі для супрацоўніцтва. Ім часам за працай асабліва няма калі і той тэлевізар глядзець, а тут трэба расказваць пра свой занятак нейкай вядучай. Аднак нашы людзі добрыя і адкрытыя, таму не пакінуць без дапамогі.

Запомніўся сюжэт, дзе я працавала на камбайне. Цяпер нават магу ганарыцца, што, можна сказаць, сваімі рукамі цэлую паласу зерня ўбрала. Яшчэ неяк зімой мы са здымачнай групай выязджалі працаваць на снегаўборачнай машыне. І калі ўжо сядзела ў яе кабіне, то заўважыла: ёсць месцы, з якімі тэхніка не можа справіцца. Тады з'явілася ідэя прасіць дапамогі ў прахожых. Узяла ў работнікаў рыдлёўку і пачала спыняць людзей, прапануючы ім прыбраць некалькі метраў снегу. Здавалася б, хвіліна часу, а карысна і весела.

**— Ці складана вам было, калі толькі прыйшлі на тэлебачанне?**

— Акцёрства па сваёй сутнасці — гэта ўменне прымяраць на сябе любое амплуа. Прафесія тэлевядучай была тады для мяне новай, але я ставілася да яе як да новай ролі, якую трэба было сыграць. Дапамагала і тое, што я ўмела працаваць на публіку. Мне не перашкаджала думка: вось зараз на мяне глядзяць тысячы вачэй. Зноў такі здымкі ў кіно — уменне «ладзіць» з камерай. Сёння я магу смела сцвярджаць, што яна — мая лепшая сяброўка. Я яе люблю, і гэта ўзаемна. Акцёрства дае многае: адчуванне свабоды, разняволенасць, уменне выказваць свае думкі і кантактаваць з іншымі людзьмі. У нас у студыі кожны дзень бывае ад аднаго да трох гасцей, і ўсе яны розныя па характары, па сацыяльным статусе, таму патрэбна быць добрым псіхолагам, каб знайсці да кожнага падыход, настроіць на эфір.

> **Запомніўся сюжэт, дзе я працавала на камбайне. Цяпер нават магу ганарыцца, што, можна сказаць, сваімі рукамі цэлую паласу зерня ўбрала.**

**— З Аляксандрам Мяжэнным хутка спрацаваліся?**

— Па тэмпераменце і ў творчым плане мы блізкія людзі, паколькі я актрыса, а Аляксандр харэограф. Зразумець адно аднаго і зблізіцца нам дапамог сцэнічны вопыт. У нас супадаюць погляды на жыццё, што таксама немалаважна; я ўпэўнена, якім бы добрым прафесіяналам чалавек ні быў, але немагчыма працаваць ад душы і выдаваць станоўчыя эмоцыі, калі адсутнічае сімпатыя паміж людзьмі. Прыемна, што Саша давярае мне як прафесіяналу, не крыўдзіцца на маю крытыку. А паверце, яе бывае шмат, і я сама не заўсёды, мабыць, змагла б вытрымаць такое. Ён жа прыслухоўваецца да маіх заўваг і парад, пачынаючы ад інтанацыі і заканчваючы выбарам гардэробу.

**— Вас часцей пазнаюць як тэлевядучую ці актрысу?**

— Мае прыхільнікі дзеляцца на тры катэгорыі. Першыя ведаюць мяне ў абодвух амплуа. Другія ўспрымаюць мяне толькі як расійскую актрысу кіно, таму сустракаюць часцей за ўсё з пытаннем: «А вы надоўга да нас прыехалі?» А для трэціх я тэлевядучая каналаў СТБ і «Расія».

**— Да публічнасці доўга прывыкалі?**

— Яшчэ дагэтуль не прывыкла. І гэта парадаксальна, таму што на працы я не баюся нічога — у любым выглядзе магу быць перад камерай, выканаю любую рэжысёрскую задачу. А ў жыцці я звычайны чалавек. Бывае, пазнаюць, напрыклад, у нейкай краме, тады я адчуваю сябе няёмка. Асабліва калі стомленая, бо на экране часцей за ўсё мы выглядаем прывабна, яскрава. Таму адчуваю сябе крыху падманшчыцай: раптам расчарую людзей? У мяне быў смешны эпізод. Неяк была ў падатковай і зайшла ў канцтавары ручку набыць. Стаю, выбіраю, а за мной знаходзіцца жанчына, якая пачынае мяне разглядваць. Потым кажа, быццам бы сама сабе, але так, каб і я чула: «Так на адну тэлевядучую падобна. Ну адзін твар! А можа, гэта яна і ёсць?» Я падумала, што непавага з майго боку стаяць да чалавека спінай, павярнулася і міла ёй усміхаюся. А ў адказ: «Мабыць, хацелася б!» Таму і так бывае: хацелася б мне быць на сябе падобнай! (*Усміхаецца.* — **Аўт.**).

**— Якім павінен быць сцэнарый фільма, каб вас зацікавіць?**

— Калі я бачу, што ў героя няма пэўнай ідэі, якую ён нясе ў сваіх паводзінах, то інтарэсу сыграць яго ў мяне не ўзнікае. А бачу глыбіню — тады хочацца паспрабаваць. Напрыклад, мне часта трапляюцца персанажы, якія спачатку адмоўныя, знаходзяцца ў пошуку саміх сябе, свайго шчасця любымі шляхамі. Потым пасля пэўных падзей такія людзі мяняюцца. І, мне здаецца, гэта добрая тэндэнцыя. Таксама характарныя ролі цікава іграць, бо можна прыдумваць усё, што толькі душа пажадае.

**— А не баіцеся пераўтварэнняў знешнасці, калі трапляеце ў рукі грымёраў, візажыстаў?**

— З асцярожнасцю стаўлюся да гэтых працэсаў. Люблю прафесіяналаў. Часам сустракаеш на праекце ўжо знаёмых людзей, а іншы раз — новых спецыялістаў. Перш за ўсё я імкнуся зразумець у размове, як бачыць мяне грымёр, а потым ужо альбо згаджаюся, альбо адмаўляюся і раблю ўсё самастойна. Я ніколі не хацела быць актрысай, а вось мара стаць стылістам і візажыстам у мяне была. Гэта мне дапамагае. Калі нехта не выклікае ў мяне даверу ці я лічу, што ў чалавека недастаткова вопыту, то арыентуюся на уласнае бачанне вобразу.

**— У паўсядзённым жыцці як клапоціцеся пра сваю прыгажосць?**

— Для нейкіх спецыяльных працэдур у мяне не хапае часу. Мне з генамі пашчасціла. Аднак стараюся весці здаровы лад жыцця, займаюся спортам. Летам люблю ездзіць на веласіпедзе.

**— Што вы ўкладваеце ў паняцце «сям'я»?**

— Сям'я для мяне — гэта ўсё. Яна трымаецца на ўзаемапаразуменні, падтрымцы і, як ні голасна прагучыць, на каханні. Мая сям'я — ціхая гавань, куды я вяртаюся з прастораў свайго вірлівага творчага жыцця. Там мне камфортна і спакойна. Муж разумее і прымае маю прафесію, што вельмі важна.

**— Як паўплывала на ваша светаўспрыманне роля маці і жонкі?**

— Перш за ўсё з'явілася пачуццё каласальнай адказнасці за сваё жыццё і здароўе. Да таго, як нарадзіўся мой сын, я была ў гэтых пытаннях досыць рызыкоўнай. Зараз імкнуся быць асцярожнай, і не таму, што вельмі сябе люблю, а таму, што я патрэбна сваім блізкім. У мяне няма права абыякава ставіцца да свайго жыцця, бо гэта засмуціць дарагіх мне людзей. А я хачу для іх шчасця.

**Алена ДРАПКО**

# За некалькі крокаў да «Еўрабачання»

**Менш чым праз тыдзень у Кіеве пачнецца міжнародны дзіцячы конкурс «Еўрабачанне-2013», на якім нашу краіну прадставіць 11-гадовы мінчанін Ілья Волкаў. Менавіта яго нумар «Спявай са мной» набраў найбольшую суму балаў ад гледачоў і прафесійнага журы.**

Усяго ж у дзіцячым песенным конкурсе сёлета ўдзельнічаюць прадстаўнікі 12 краін, прычым палова з гэтага тузіну — постсавецкія. Таксама спецыяльнымі гасцямі Еўратыдня будуць дэлегацыі Грэцыі і Казахстана — краін, якія не бяруць удзел у конкурсе, але маюць жаданне пабываць на ім і прадставіць сваю музычную культуру.

Месцам правядзення дзіцячага «Еўрабачання-2013» абраны Нацыянальны палац мастацтваў «Украіна», а вядучымі шоу, нагадаем, стануць Цімур Міршнічэнка і спявачка Злата Огневіч.

Наша дэлегацыя вылятае ва ўкраінскую сталіцу ўжо ў нядзелю вечарам, а з панядзелка юных артыстаў чакае напружаная праца: запіс відэа-візітовак і агульнай песні, рэпетыцыі, інтэрв'ю і г. д. Лёсаванне парадку выступленняў юных артыстаў адбудзецца 25 лістапада — тады і даведаемся, пад якім нумарам выйдзе на сцэну беларускі канкурсант. Пакуль жа, паводле слоў самога Ільі, перадконкурснага хвалявання ён практычна не адчувае. «Я сябе настройваю на тое, што ўсё будзе нармальна, што я добра выступлю, добра станцую», — прызнаўся юны артыст падчас анлайн-канферэнцыі, зладжанай на сайце Белтэлерадыёкампаніі.

У Кіеў беларуская дэлегацыя павязе традыцыйную для конкурсу прамапрадукцыю нашага ўдзельніка. У гэтым пакеце, паводле слоў выканаўчага прадзюсара тэлеканала «Беларусь 2» Людмілы Барадзіной, ёсць свая цікавінка. «Акрамя абавязковых элементаў прома, мы кожны раз стараемся зрабіць які-небудзь цікавы дадатак. Сёлета гэта тынейджарская палатняная эка-сумка з яркім прынтам у выглядзе магнітафона. Калі падлетак нясе яе на плячы, складваецца адчуванне, быццам гэта сапраўдны магнітафон». А ў маляўнічую папку-буклет змясцілі дыск з песняй, найлепшыя здымкі з адмысловай «фотасесіі ў стылі рок» і ўсю інфармацыю пра беларускага канкурсанта і яго інтэрнацыянальную каманду.



Фінальнае шоу дзіцячага конкурсу «Еўрабачанне-2013» адбудзецца ў Кіеве 30 лістапада пад дэвізам «Be creative». Прамую трансляцыю яго будуць весці тэлеканалы «Беларусь 1» і «Беларусь 24».

## Тым часам

*Да завяршэння прыёму заявак дарослых артыстаў, якія жадаюць прадставіць Беларусь на «Еўрабачанні-2014», засталося ўсяго некалькі дзён. Апошні тэрмін адпраўкі каштоўных бандэроляў — 24 лістапада.*

*Да 29 лістапада прафесійнае журы, удзел у якім пацвердзілі старшыня Белтэлерадыёкампаніі Генадзь Давыдзька, народныя артысты Беларусі Васіль Раінчык і Аляксандр Ціхановіч, заслужаная артыстка Беларусі, удзельніца «Еўрабачання-2013» Алена Ланская, кіраўнік школы танца «ШТАМ» Аляксандр Мяжэнны, абярэ 15 шчаслівчыкаў, што трапяць адразу ў фінал нацыянальнага адбору. Канчаткова ж вызначыцца Беларусь са сваім удзельнікам у студзені 2014 года.*

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**

■ Тэлесеткі

# Сім-сім, адчыніся!

**З 1 снежня тэлеканал «Беларусь 5» трапіць у аналагавыя пакеты аператараў**

«Як і дзе можна ўбачыць спартыўны тэлеканал?» «Чаму ў праграме «Беларусь 5» ёсць, а ў тэлевізары няма?» З гэтымі і сотняй іншых пытанняў балельшчыкі некалькі тыдняў нястомна тэлефанавалі ў рэдакцыі газет, у Белтэлерадыёкампанію, да кабельных аператараў.

Яшчэ на пачатку месяца першы беларускі спартыўны тэлеканал быў даступны для прагляду далёка не ўсім, а дакладней, толькі жыхарам сталічнай вобласці — падпісчыкам лічбавых пакетаў «МТІС», «Космас-ТБ», «Zala», «Аксіёма-Сэрвіс». І вось, нарэшце, у нас ёсць для балельшчыкаў і гледачоў добрая навіна. Нават дзве. З 18 лістапада сігнал тэлеканала РУП «Белтэлекам» дастаўляецца ва ўсе абласныя і раённыя цэнтры краіны, гэта значыць, яго могуць уключаць у свае сеткі кабельныя аператары на ўсёй тэрыторыі Беларусі — дастаткова звярнуцца ў «Белтэлекам» і Белтэлерадыёкампанію ды заключыць адпаведныя дагаворы, каб атрымаць правы на трансляцыю.

А з 1 снежня запланавана ўключэнне «Беларусь 5» у аналагавую сетку аператараў «Zala» і «МТІС». А значыць, матчы прэм'ер-лігі чэмпіянату Англіі па футболе, гульні КХЛ, гандбольная Ліга чэмпіёнаў, лёгкаатлетычныя спаборніцтвы і іншыя спартыўныя баталіі, дарэчы, многія — у прамым эфіры, — стануць бліжэй да беларускіх балельшчыкаў

■ А не шкодзь!

# За кожнага рака — па дзве сотні...

**Работнікі Светлагорскай міжрайінспекцыі на мясцовым вадасховішчы затрымалі жыхара пасёлка Сасновы Бор, які разам з хаўруснікам незаконна здабыў 420 асобін вузкапалага рака ў перыяд забароны на яго лоўлю.**

Падчас затрымання браканьер не падпарадкаваўся супрацоўнікам інспекцыі, а яго сябрук увогуле збег. Пазней ён быў затрыманы па месцы жыхарства. Незаконная здабыча пацягнула нанясенне шкоды навакольнаму асяроддзю ў асабліва буйным памеры — 683 базавыя велічыні, або амаль 89 мільёнаў рублёў. Калі падзяліць гэтую суму на колькасць незаконна вылаўленых ракаў, выйдзе, што кожная асобіна каштавала больш за 200 тысяч рублёў. Гэта не лічачы крымінальнай адказнасці.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■ Медыяпрастора

| | | | |
|---|---|---|---|
| Брэст | 106.6 FM | Бабруйск | 103.6 FM |
| Віцебск | 101.8 FM | Баранавічы | 98.4 FM |
| Мінск | 107.1 FM | Салігорск | 104.3 FM |
| Гродна | 104.2 FM | Пінск | 103.2 FM |
| Магілёў | 107.8 FM | | |

# «СМАК»

Што такое цыганскі суп і навошта есці жывых васьміногаў? Як прыгатаваць аднарога па старадаўнім рэцэпце?

Усё-ўсё-ўсё, што тычыцца ежы — крыніцы сапраўднага чалавечага шчасця, у праграме «Смак» з Ірай Клёнавай на радыё «Мір». З ёй мы выкрыем ілжэдыеты і даведаемся пра самыя апетытныя навіны кулінарнага свету. А таксама пра тое, што француженкі былі прызнаны самымі стройнымі дзяўчатамі Заходняй Еўропы, а трэндам гэтага сезона з'яўляецца мятная жвачка, якую ў многіх рэстаранах бясплатна дадаюць да рахунку, і пра шмат што іншае.

Пагурманім разам?.. Кожны будны дзень у 13:45 і 22:15 на «мірнай» хвалі.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## ПАНЯДЗЕЛАК, 25 ЛІСТАПАДА

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.20** Навіны.
**7.05, 8.05** Дзелавое жыццё.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.00** Зона Х.
**9.10** У цэнтры ўвагі.
**10.05 Камедыя «Міс Пецігру жыве сённяшнім днём».**
**12.10** Дзень у вялікім горадзе.
**13.20** Клуб рэдактараў.
**14.10** Вакол планеты.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25** Журналісцкае расследаванне.
**15.55** Заўтра — гэта мы!
**16.30** Усё як трэба!
**17.00 Меладрама «Самая абаяльная і прывабная».**
**19.20** Арэна.
**19.55** Форум.
**21.00** Панарама.
**21.45 Дэтэктыў «Шулер».**
**23.35** Дзень спорту.
**23.45 Фантастыка «Суддзя Дрэд».**

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Раніца.
**9.00, 21.20** Тэлебарометр.
**9.05, 17.55 Серыял «Двое з куфра».**
**10.10** Навіны надвор'я.
**10.45, 0.05 Серыял «Следства вядзе Да Вінчы».**
**11.55** Пад грыфам «Вядомыя».
**12.30** «Азбука добрага самаадчування».
**13.05 Драма «34-ы хуткі».**
**14.45 Баявік «Вясна ў Парыжы».**
**16.40** Беларуская часінка.
**18.55 Камедыя «Дуэты».**
**21.25** КЕНО.
**21.30 Серыял «Інтэрны».**
**23.05 Серыял «Рэальныя хлопцы».**

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.30** «Дабраранак».
**8.00, 12.30, 18.20, 0.00** «Калейдаскоп».
**8.05, 12.35, 0.10** «Год у гісторыі».
**8.20** «Лабірынты». Прырода і гісторыя Асвейшчыны.
**8.55** «Скарбніца Берасцейшчыны». Высокае. «Знямелая музыка». Пра рэзідэнцыю Сапег.
**9.20** «Наша спадчына». Эпоха класіцызму і рамантызму.
**9.35, 22.20 «Раскол». Маст. фільм.**
**10.20, 21.50** «Дыя@блог». «Пра мову».
**10.50, 18.30 «Пётр I». Маст. фільм.**
**12.50, 23.35** «Святло далёкай зоркі».
**13.20, 23.10** «Аўтограф».
**13.45** «Маё кіно. Валерый Панамароў». Дак. фільм.
**14.20** «Белы бусел». Не размініся з мараю». Пілатажная група «Белая Русь».
**15.00** «Найменні і вобразы». Ткацтва.
**15.15 «Адступнік». Маст. фільм.**
**17.55** «Наперад у мінулае».
**20.30** Калыханка.
**20.50 «Суседзі». Маст. фільм.**

### БЕЛАРУСЬ 5

**8.05** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. «Кардзіф» — «Манчэстэр Юнайтэд».
**9.55** Біятлон. Этап Кубка свету ў Астэрсундзе. Змешаная эстафета.
**11.30** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. «Тотэнхэм» — «Манчэстэр Сіці».
**13.20** Хакей. КХЛ. «Дынама» (Мінск) — «Металург» (Магнітагорск).
**15.15** Футбол. Чэмпіянат Англіі.
**17.00** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Дынама» (Мінск) — БАТЭ.
**18.50** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Гомель» — «Юнацтва».
**21.25** Авертайм.
**21.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**22.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. «Вест Бромвіч» — «Астон Віла».

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** Контуры.
**10.05** «Жыць здарова!».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10 Серыял «Закрытая школа».**
**12.10** «Самы лепшы муж».
**13.10** «Добрага здароўейка!».
**13.55** «Модны прыгавор».
**15.00** «Сам-насам з усімі».
**16.15** «Зразумець. Даравацьʼ».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.20** «Адваротны адлік». «Барыс Савінкаў. Чужы сярод сваіх». Фільм першы.
**19.00** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.05** Ток-шоу «Пазіцыя».
**22.05** «КВЗ-2013». Кубак мэра Масквы.
**0.15** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Мінщчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30** «Тыдзень».
**9.45** «Вялікае снеданне».
**10.40, 17.30** «Званая вячэра».
**11.35** «Такі лёс».
**12.30** «Джэймі: у пошуках смаку».
**13.00** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**13.50** «Вялікі горад».
**14.30** «Зорны рынг». Новы сезон. Бітва кавер-бэндаў». «Inomarki» супраць «Jingle Band».
**15.50** «100 працэнтаў».
**16.20** «Наша справа».
**16.50** «Па законе».
**18.30** «Вялікія тайны. Сцяжкай гігантаў».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Гарады, якія спяваюць». Дзённік.
**20.30 Маст. фільм «Каралі рулеткі».**
**23.00** «Ваенная тайна».
**0.45 «Адмірал». Серыял. Заключныя серыі.**

### МІР

**5.00 Серыял «Пяць хвілін да метро».**
**6.35** М/ф.
**7.05** «Цік-так».
**7.20 Серыял «Заручальны пярсцёнак».**
**9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 21.00** Навіны Садружнасці (бягучы радок).
**9.10 Маст. фільм «Сем крыкаў у акіяне».**
**10.30, 0.35** «Свае людзі».
**10.55** «Разам».
**11.45** «Агульны рынак».
**12.20, 3.30 Серыял «Клон».**
**14.10** Дак. фільм «У сэрцы каменных джунгляў».
**15.20, 22.05** Ток-шоу «Слова за слова».
**16.20 Серыял «Танга з анёлам».**
**18.25** «Беларусь сёння».
**19.00 Серыял «Дзевяць жыццяў Нестара Махно».**
**21.25** «Акцэнты».
**21.40, 4.25** Дак. фільм «Рэальны свет».
**23.00 Серыял «Тайная варта».**
**1.00 Маст. фільм «Чынгіз Хан».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.00** «Карціна свету».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Ранішняя@пошта».
**12.00** «Прамы эфір».
**13.00** «Шукальнікі».
**13.50, 16.50, 19.50, 0.35** Навіны — Беларусь.
**14.30** «1000 дробязяў». Ток-шоу.
**15.10** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.55** «Асаблівы выпадак».
**17.10 Серыял «Ефрасіння. Таежнае каханне».**
**18.05 Серыял «Тайны інстытута высакародных дзяўчат».**
**18.55, 20.40 Серыял «Пілот міжнародных авіяліній».**
**21.45 Серыял «Руская наследніца».**
**22.45 Серыял «Шэрлак Холмс».**
**0.45** «Пад уладай смецця».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «НТБ раніцай».
**8.40** «Новыя рускія сенсацыі».
**9.35, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**11.00** «Да суда».
**11.55** «Суд прысяжных».
**13.25** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.25** «Справа ўрачоў».
**15.15** «Справа густу».
**15.40, 18.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.35 Маст. фільм «Гаспадар».**
**21.30, 23.40 Серыял «Пятніцкі. Глава трэцяя».**
**23.15** Сёння. Вынікі.
**0.35** «Бульдог-шоу».

### 8 КАНАЛ

**7.00, 12.15, 19.10, 21.05, 23.45** «Надвор'е».
**7.05** «На рыбалку».
**7.20, 14.15 Серыял «Цудоўнае стагоддзе».**
**9.00, 17.45 Серыял «Касл».**
**10.25 «Сінематограф». Маст. фільм «Гэта здарылася аднойчы ноччу».**
**12.20 Меладрама «Вялікія надзеі».**
**16.00** Мультпарад.
**16.30** «Мой любімы гадавалец».
**17.00 Серыял «Пякельныя коткі».**
**19.15 Серыял «Удар у адказ».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.10 Драма «Джоні».**
**23.30** «Кінаблакнот».

### ВТБ

**6.00, 1.00** «PLAY».
**8.00, 14.00, 18.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**8.30, 17.30** «С.У.П.».
**9.00** «Сняданкі свету».
**9.30** «Дом мары».
**10.00** «Шчасце без ахвяр».
**11.00, 22.20 Серыял «Маргоша».**
**12.00, 21.10 Серыял «Маладзёжка».**
**13.00, 16.30** Скетч-шоу «Анекдоты».
**13.30, 17.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**14.30** «Улётнае відэа».
**15.00 Серыял «Крамлёўскія курсанты».**
**16.00, 18.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**19.00 Серыял «Васьмідзясятыя».**
**20.00 Серыял «Апошні з Магікян».**
**23.30** «Аўташкола».
**0.00** «Дарожныя войны».
**0.30** «Ч.П?».

### НАСТАЛЬГІЯ

**5.00** «Быў час». 2008 год.
**6.00** «Шынок 13 крэслаў» «Пан дырэктар жэніцца». 1978 год.
**7.15** «Вечар памяці Высоцкага». 1988 год.
**9.00 «Развітальныя гастролі». Маст. фільм.**
**10.10** «Вячэрнія мелодыі». Фільм-канцэрт. 1985 год.
**11.00** «Праграма «А». 1990 год.
**12.00, 3.00** «Колба часу».
**13.05** «Гэтыя неверагодныя музыкі». 1977 год.
**14.10** «Музыка і мы». 1987 год.
**15.20** «Птушыны палёт». Фільм-спектакль М. Жванецкага. 1990 год.
**17.00** «...Да 16 і старэйшым». 1991 год.
**17.50** «Настальгія па Ташкенце». Дак. фільм.
**18.40 «Два дні ў пачатку снежня». Маст. фільм.**
**20.00, 2.00** «Час».
**21.00** «Народжаны ў СССР».
**22.00** «Творчы вечар кампазітара А. Пахмутавай». 1975 год. 1-я частка.
**23.00** «З лёсам пра лёс...». Перадача з удзелам Аляксея Баталава. 1994 год.
**23.45** «Эстрадны вернісаж». 1991 год.
**0.40** «Калісьці ў Каліфорніі». Фільм-спектакль. 1976 год.
**4.00** «Кінапанарама». «Кінатаўр-91». 1991 год.

### EUROSPORT

**10.30, 14.30, 19.00, 21.15, 2.30** Скачкі на лыжах. Кубак свету.
**11.30, 16.00, 20.30, 1.45** Біятлон. Кубак свету.
**12.30** Фігурнае катанне. Кубак Расіі.
**17.00** Кёрлінг. Чэмпіянат Еўропы. Мужчыны.
**19.30, 0.45** Футбол. Еўрагалы.
**22.45** Вось гэта дзіва!!!
**23.00** Пра рэслінг.
**0.30** Коннаспартыўны часопіс.

### КАМЕДЫЯ

**5.00, 10.55, 17.00, 19.00, 2.05** Скетчком «Паміж намі».
**5.15, 2.20** Серыял «Прападобны».
**6.15** Прыгоды «Дзіца напракат».
**7.40, 12.40, 16.45, 18.50, 21.50** «Камедыянты. Лепшае».
**8.00, 12.55, 16.00, 21.00, 2.50** Серыял «Маё вялікае грэчаскае жыццё».
**9.00** Камедыя «Дыска».
**11.15** Камедыя «Дзяжурны тата ў лагеры».
**13.40** Камедыя «Банк».
**14.10** Меладрама «Прынц і танцоўшчыца».
**17.20** Камедыя «Трэзор».
**19.20** Камедыя «Слухач».
**21.25** Серыял «Доўга і шчасліва». 1-я серыя.
**22.10** Камедыя «Эмігрант».
**0.10** Камедыя «Збеглая нявеста».
**3.25** Прыгоды «Дарога ў Занзібар».

### ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

**2.00, 8.00, 14.00** Камедыя «Прыгоды Толі Клюквіна».
**3.05, 9.05, 15.05** М/с. «Раз'юшаны Бамбр», фільм 1-ы. «Зборнік м/ф «Перапынак № 2», «Крылы дзядзечкі Марабу». «Вартавыя палёў». «Няўдачнікі».
**4.00, 10.00, 16.00** М/с. «Сандакан. Два тыгры». Легенды і міфы старажытнай Грэцыі. «Фаэтон — сын Сонца». Зборнік м/ф «Адважны марак». «І я мог бы».
**5.00, 11.00, 17.00** Камедыя «Кропля ў моры». М/ф «Сіндбад-мараход».
**6.30, 12.30, 18.30** М/с «Воўк Альберта».
**7.00, 13.00, 19.00** «Урокі цётачкі Савы». Зборнік м/ф «Заўтра будзе заўтра». «Аб тым, як гном пакінуў дом». «Салодкая казка».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**8.30, 18.30, 3.45** «Цудоўнае стагоддзе». Серыял.
**10.15** «Паненка і кулінар».
**10.45, 17.00** «Паралельны свет». Дак. серыял.
**11.45, 16.00** «Варажбітка». Дак. серыял.
**12.45, 18.00** «Паляўнічыя на прывідаў». Дак. серыял.
**13.10** «Жонка». Галіна Волчак.
**14.30** «Сто пытанняў даросламу». Аляксей Вараб'ёў.
**15.15, 0.15, 5.15** «Звышнатуральнае». Серыял.
**20.30** «Непераможны». Серыял. Заключная серыя.
**21.30** «Апостал». Серыял. Заключная серыя.
**22.30** «Манашка». Маст. фільм.
**1.00** «Быць чалавекам». Серыял.
**2.00** «Сапраўдная кроў». Серыял.
**2.50** «Часова даступны». Надзея Бабкіна.

### ТБ1000

**5.00** Меладрама «Крок наперад 3».
**7.00** Трылер «Экстрасэнс».
**8.55** Камедыя «Ужо хто б казаў 3».
**10.40** Трагікамедыя «Мачаха».
**13.00** Драма «Павуцінне хлусні».
**15.25** Драма «У пагоні за шчасцем».
**17.40** Трагікамедыя «Моцная жанчына».
**20.20** Драма «Каханне і іншыя акалічнасці».
**22.20** Меладрама «Шчаслівчык».
**0.30** Драма «Вавілон».
**3.00** Баявік «Напад на 13-ы ўчастак».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.00** Драма «Адзіная».
**8.00** Камедыя «Дачка якудзы».
**10.00** Меладрама «На кручку!».
**12.00** Драма «Адпачынак у верасні».
**14.00** Камедыя «Гульня».
**16.00** Камедыя «Трое ў лодцы, не лічачы сабаку».
**18.30** Драма «Доўгае шчаслівае жыццё».
**20.00** Меладрама «Спатканне».
**21.35** Мюзікл «Стылягі».
**0.00** Баявік «Бой з ценем».
**2.30** Баявік «Бой з ценем: Рэванш».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00** Джон Кенэдзі: сем дзён, якія вызначылі прэзідэнта.
**7.00** Гіганцкая панда.
**8.00, 13.00** Забойства Кенэдзі.
**10.00** Гульня ў лічбы.
**11.00** Мегазаводы.
**12.00, 18.00** Шаша праз пекла.
**15.00** Няўлоўная расамаха.
**16.00** Сесар Мілан: Важак зграі.
**17.00, 2.00** Выратавальны атрад.
**19.00** Расследаванні авіякатастроф.
**20.00, 0.00, 3.00** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**21.00, 1.00, 4.00** Амерыканская мафія.
**22.00** Ліхтугі за мяжой.
**23.00** Турэмныя цяжкасці.

### DISCOVERY

**7.00, 16.25** Залатая ліхаманка.
**7.50, 12.20, 3.05** Беар Грылс: па слядах тых, хто выжыў.
**8.40, 20.35** Як гэта ўстроена?
**9.10, 20.05, 4.45** Як гэта зроблена?
**9.35, 17.20** Адпетыя рыэлтары.
**10.30** Цуды Сонечнай сістэмы.
**11.25, 3.55** Разбуральнікі легенд.
**13.15, 5.10** Хуткія і гучныя.
**14.10, 6.05** Махінатары.
**15.30** Зброя па-амерыканску.
**18.15** Не спрабуйце паўтарыць.
**19.10** Геній распрацовак.
**21.00** Выжыць разам.
**22.00** Беар Грылс: выбрацца жывым.
**23.00** Правілы пазадарожнага руху.
**0.00** Скрозь кратовую нару.
**0.55** Top Gear ЗША.
**1.50** Вулічныя гонкі.
**2.40** Маланкавыя катастрофы.

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Пачалася падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2014 года!

Шаноўныя сябры!

Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.

Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым калядным падарункам для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.

| Індэкс/перыяд | 1 месяц | 3 месяцы | 6 месяцаў |
|---|---|---|---|
| 63850 (для індывідуальных падпісчыкаў) | 47 500 | 142 500 | 285 000 |
| 63145 (для ветэранаў ВАВ і пенсіянераў) | 42 750 | 128 250 | 256 500 |
| 63858 (для ведамасных падпісчыкаў) | 95 300 | 285 900 | 571 800 |
| 63239 (ведамасная падпіска для ўстаноў міністэрстваў адукацыі, культуры і аховы здароўя) | 85 800 | 257 400 | 514 800 |

# АТЭСТАЦЫЯ ПЕДАГОГАЎ...

## Пераэкзаменоўка для педагогаў-пенсіянераў

— У ЦК прафсаюза не спыняецца паток пытанняў, якія датычаць атэстацыі педагагічных работнікаў. Шмат пытанняў паступае ад педагогаў, якія маюць вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю ўжо 20–25 гадоў, ад педагогаў перадпенсійнага і пенсійнага ўзросту,— паведаміла **загадчык аддзела сацыяльна-эканамічнай работы ЦК прафсаюза Валянціна ГЕРАСІМОВІЧ.**— Сутнасць такіх пытанняў зводзіцца да аднаго: навошта чалавеку, якому да выхаду на пенсію засталося год ці два, педагогу, які ўжо выйшаў на пенсію, або педагогу, які працуе ў школе толькі часова (напрыклад, на месцы «дэкрэтніцы») ісці на кваліфікацыйны экзамен? І мы вымушаны ім тлумачыць, што для таго, каб атрымліваць даплату за вышэйшую катэгорыю пасля 1 верасня 2014 года, яе давядзецца пацвярджаць. Гэта абавязковая ўмова для ўсіх работнікаў, незалежна ад іх ўзросту. Справа ў тым, што работнікі пенсійнага ўзросту маюць не толькі тыя ж працоўныя правы, што і ўсе астатнія, але і адпаведныя абавязкі, у тым ліку і ў плане павышэння кваліфікацыі і пацвярджэння катэгорыі. Іншая справа, наколькі яны могуць быць зацікаўлены ў пацвярджэнні вышэйшай катэгорыі, улічваючы мізэрную даплату?.. У тым выпадку, калі педагог-пенсіянер адмовіцца ад пацвярджэння, яго кваліфікацыйная катэгорыя будзе зніжана да першай.

Увогуле, **прафсаюз лічыць, што, калі ў бліжэйшы час пытанне з павелічэннем надбавак за кваліфікацыйныя катэгорыі не будзе вырашана, ёсць сэнс ставіць пытанне аб адмене абавязковага кваліфікацыйнага экзамену на пацвярджэнне вышэйшай катэгорыі.** У рэшце рэшт, педагогі павінны быць самі зацікаўлены ў павышэнні кваліфікацыі, але для гэтага неабходна задзейнічаць у тым ліку і фінансавыя стымулы…

## «Дашкольнікі» шлюць сігналы «SOS»

Вельмі няпростая сітуацыя склалася сёння ў дашкольнай адукацыі. З-за вельмі нізкіх заробкаў дэфіцыт кадраў у гэтай сістэме набыў ужо хранічны характар, але новы парадак атэстацыі праблему толькі яшчэ больш абвастрыў.

— Абавязковай умовай допуску педагагічнага работніка да атэстацыі на прысваенне кваліфікацыйнай катэгорыі з'яўляецца адпаведнасць атрыманай адукацыі кваліфікацыйным патрабаванням. Але ні для каго не сакрэт, што ў дзіцячых садках працуе шмат спецыялістаў з непрофільнай педагагічнай адукацыяй. Так, у дзіцячых садках Брэста толькі каля 60% педагогаў маюць «дашкольную адукацыю»,— паведаміла **загадчык яслей-сада № 69 г. Брэста Галіна ЯНГОЛЕНКА.**— Значыць, 40% педагогаў могуць з сістэмы адукацыі сысці. Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна выпусціў сёлета толькі 24 маладыя спецыялісты па профілі «педагогіка дзяцінства». Таму, каб закрыць вакансіі, у дзіцячыя садкі накіроўваюцца выпускнікі іншых педагагічных спецыяльнасцяў. І сярод іх шмат таленавітых і перспектыўных педагогаў. Але мы не сумняваемся, што **пасля двух гадоў работы па размеркаванні маладыя спецыялісты сістэму дашкольнай адукацыі пакінуць, бо права атрымаць нават другую кваліфікацыйную катэгорыю ў іх няма.** А ў тых педагогаў без профільнай адукацыі, якія ўжо атрымалі другую ці першую катэгорыю, няма ніякіх перспектыў атрымаць, адпаведна, першую і вышэйшую кваліфікацыйныя катэгорыі. Такім чынам, мы фактычна губляем дашкольную адукацыю, бо хто заўтра пойдзе да нас працаваць?


Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Больш за тое, у горадзе ўжо і некаторыя загадчыкі дзіцячых садкоў таксама збіраюцца пакінуць сваю пасаду, каб перавесціся ў выхавацелі. Уся справа ў тым, што ў загадчыкаў адабралі права атрымаць або пацвердзіць вышэйшую катэгорыю. Дырэктар школы, які паралельна з асноўнай работай мае 5–10 гадзін вучэбнай нагрузкі, можа прайсці атэстацыю як настаўнік і атрымліваць кваліфікацыйную надбаўку, а загадчыку дзіцячага садка такую магчымасць не пакінулі. Загадчык мае права толькі працаваць на замене сваіх педагагічных работнікаў, якія часова адсутнічаюць, што ўсе і робяць. На замене загадчыкі ў гарадскіх садках адпрацоўваюць ад 30 да 50% нормы гадзін выхавацеля на стаўку, але гэта не дае ім права атэстоўвацца як выхавацелям. Таму наша прапанова — вярнуць права на атрыманне кваліфікацыйнай катэгорыі ўсім педагагічным работнікам, што працуюць у дашкольных установах, і дазволіць загадчыкам дзіцячых садкоў пацвярджаць ці атрымліваць катэгорыю пры пэўным аб'ёме педагагічнай нагрузкі — напрыклад, калі на замене выхавальнікаў яны будуць працаваць 240 гадзін у год і больш.

## Дырэктар ужо не педагог?

Між іншым, і з атэстацыяй дырэктараў школ, прафесійна-тэхнічных і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў усё неадназначна. Так, **кіраўніку ўстановы адукацыі для пацвярджэння вышэйшай кваліфікацыі абавязкова трэба працаваць яшчэ і на пасадзе настаўніка ці іншага педагагічнага работніка.** Добра, калі дырэктар школы зможа знайсці вучэбную нагрузку на чвэрць стаўкі, каб у якасці настаўніка захаваць сваю катэгорыю і даплаты, а калі — не? І што рабіць дырэктару каледжа, які выкладае дысцыпліну, не звязаную з профілем атрыманай ім спецыяльнасці? Чаму дырэктар гімназіі, які вядзе ўсяго 3 гадзіны гісторыі, але кожны год мае пераможцаў прадметнай алімпіяды, пазбаўлены права пацвердзіць вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю? Адным словам, пытанняў вельмі шмат…

Але бадай што самым праблемным у новай інструкцыі стаў 20 пункт, паводле якога **педагог, які працаўладкоўваецца ў іншую ўстанову адукацыі не шляхам пераводу, можа пазбавіцца сваёй кваліфікацыйнай катэгорыі.** Напрыклад, калі скарочаны настаўнік з вышэйшай катэгорыяй ідзе працаваць выхавальнікам у школу-інтэрнат, у дашкольную ўстанову, у групу падоўжанага дня ці ўстанову дадатковай адукацыі, ён можа пазбавіцца сваёй катэгорыі і яму давядзецца пачынаць «кар'еру» фактычна з нуля: спачатку адпрацаваць два гады, каб прэтэндаваць на другую катэгорыю, затым яшчэ тры гады, каб «замахнуцца» на першую, і гэтак далей. А ўсё таму, што ў яго працоўнай кніжцы напісана «звольнены».

**Сёння дзень па краіне ўжо больш як 3,5 тысячы педагогаў пацвердзілі вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю, а не пацвердзілі яе толькі 6 чалавек з агульнай колькасці тых, хто здаваў экзамен.**

Магчыма, калі вялася работа над новай інструкцыяй, ніхто яшчэ не ўяўляў сабе маштабы аптымізацыі і рэарганізацыі сеткі ўстаноў адукацыі, але па факце сёння многія педагогі вымушаны працаваць не па сваім профілі, а там, дзе для іх знайшлася работа. Улічваючы актуальнасць гэтай сітуацыі, прафсаюз мае намер дабівацца змянення фармулёўкі 20-га пункта, каб у далейшым у педагогаў была магчымасць захаваць катэгорыю не толькі ў выпадку пераводу работніка.

## Дапамажыце абагульніць вопыт!

Што да самой працэдуры здачы кваліфікацыйнага экзамену ў новых умовах, то, як высветлілася, для многіх педагогаў пэўнай перашкодай стала неабходнасць абагульнення педагагічнага вопыту. Педагогі сваю пазіцыю аргументуюць наступным чынам: маўляў, педагогіка — тая прафесія, прадстаўнікам якой пастаянна даводзіцца займацца самарэкламай. Яны даюць адкрытыя ўрокі, удзельнічаюць у конкурсах, рыхтуюць сваіх вучняў да ўдзелу ў конкурсах і алімпіядах. Адным словам, знаходзяцца ў стане ацэньвання пастаянна, а не раз у пяць гадоў… **Таму прапанаваць распрацоўкі сваіх урокаў для педагога значна прасцей, чым сесці і на дзесяці лістах паперы аформіць і выкласці напрацаваны вопыт.** Да таго ж гэта работа вымагае ў настаўніка шмат часу і сіл. Магчыма, трэба было прадугледзець большую варыятыўнасць у правядзенні экзамену? Напрыклад, даць магчымасць настаўніку правесці серыю адкрытых урокаў…

На думку **прарэктара Акадэміі паслядыпломнай адукацыі па навукова-метадычнай рабоце Галіны НІКАЛАЕНКІ,** пісьмовае абагульненне і афармленне педагогамі ўласнага вопыту дае магчымасць занатоўвання лепшага, фарміравання своеасаблівай скарбонкі цікавых распрацовак і ідэй, якія ў далейшым могуць стаць асновай для навучання іншых.

— Пацвярджэнне кваліфікацыйнай катэгорыі з'яўляецца агульнапрызнанай сусветнай практыкай. **Сёння па краіне ўжо больш як 3,5 тысячы педагогаў пацвердзілі вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю, а не пацвердзілі яе толькі 6 чалавек з агульнай колькасці тых, хто здаваў экзамен.** Я лічу, што гэта лепшае сведчанне таго, што кваліфікацыйны экзамен не з'яўляецца наступам на правы настаўніка. Што дрэннага ў тым, калі ваш вопыт будзе заслуханы? — пацікавілася ў педагогаў Галіна Нікалаенка.— Экзамен на прысваенне новай катэгорыі «настаўнік — метадыст» здаў ужо 31 педагог. І пададзены яшчэ 44 заяўкі.

На працягу года на базе Акадэміі паслядыпломнай адукацыі праводзіліся таксама экзамены на прысваенне педагогам вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі. Па стане на 11 лістапада ў Акадэміі **здалі экзамен 728 чалавек, з іх не здолелі даказаць сваё права на вышэйшую катэгорыю 126 чалавек, або 17,3% ад агульнай колькасці.** Галоўнай прычынай, па якой педагогі не набралі патрэбную колькасць балаў, сталі праблемы з прадметнай кампетэнтнасцю экзаменуемых. Праўда, як адзначаюць у Акадэміі, колькасць тых, хто не змог здаць экзамен на прысваенне вышэйшай катэгорыі, пачала паступова змяншацца.

Звяртаюць у Акадэміі ўвагу і на яшчэ адну праблему: 436 педагогаў, якім былі адпраўлены запрашэнні, на экзамен у Мінск не прыехалі — а гэта, між іншым, 35% ад агульнай колькасці запрошаных. Прычыны самыя розныя: хвароба, сямейныя абставіны, разуменне адказнасці мерапрыемства, да якога, магчыма, педагогі не паспелі належным чынам падрыхтавацца.

Сёння ў Міністэрстве адукацыі вядзецца работа над карэкціроўкай інструкцыі. Пажаданне педагогаў — каб гэты дакумент быў максімальна празрыстым, дакладным і зразумелым. Каб не даводзілася чытаць нешта паміж радкоў або шукаць іншы дакумент дзесяцігадовай даўнасці, які растлумачыць некаторыя палажэнні інструкцыі. Напрыклад, інструкцыя прадастаўляе права кіраўнікам установы адукацыі накіроўваць педагагічных работнікаў, якія знізілі ўзровень сваёй работы, на пацвярджэнне першай і другой кваліфікацыйнай катэгорыі, але канкрэтных, абсалютна празрыстых і зразумелых усім крытэрыяў зніжэння вынікаў педагагічнай дзейнасці сёння няма. Таму абароненасці настаўнікаў гэты пункт дакладна не спрыяе.

**Старшыня ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Аляксандр БОЙКА** ўпэўнены, што атэстацыя педагогаў з'яўляецца неад'емнай умовай павышэння якасці адукацыі, але абысціся без задзейнічання фінансавых рычагоў немагчыма. Кваліфікацыйная катэгорыя павінна быць не проста часткай іміджу педагога, а гарантаваць яму адпаведны ўзровень заробкаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

■ Святло рампы

# УСЕ ПРАФЕСІЯНАЛЫ ПАЧЫНАЛІ З АМАТАРАЎ

**Каб адзначыць усіх дастойных на фестывалі аматарскіх тэатральных калектываў у Магілёве, у журы нават не хапала дыпломаў.**

Гарадскі фестываль аматарскіх тэатральных калектываў «Святло рампы» праводзіцца ў Магілёве з 2000 года, але толькі ў апошнія гады ён пачаў набіраць сваю моц. На тэатральнай мове рампа — сімвал святла і творчых пошукаў. Філосаф кінікаў Дыяген, які жыў у Афінах і Карынфе ў IV стагоддзі да нашай эры, блукаў па рынкавай плошчы з высока ўзнятай паходняй — сімвалам пошуку ісціны і дабрачыннасці. У фестывалю таксама ёсць свая сімволіка — эмблема з газавай лямпай, вакол якой танцуюць матылькі. На свет «магілёўскай» рампы на гэты раз «зляцеліся» 11 аматарскіх тэатральных калектываў з Мінска, Магілёва, Хоцімска, Жодзіна, Оршы. На працягу 4 дзён яны абсалютна бясплатна радавалі жыхароў і гасцей культурнай сталіцы Беларусі і краін СНД сваім мастацтвам.

Як адзначыў на прэс-канферэнцыі фестывалю старшыня журы, прафесар Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Рыгор Баравік, шмат хто з прафесіяналаў таксама пачынаў на аматарскіх падмостках. «Нацыянальнае мастацтва гэта толькі ўзбагачае,— падкрэсліў ён.— Фестываль адметны тым, што ў ім удзельнічаюць не толькі заслужаныя калектывы і студыі, а нават гурткі. А значыць, у тэатральным мастацтве таксама існуе іерархія. Што вельмі добра, бо павінны быць умовы для развіцця і росту».

Дарэчы, хоць фестываль і сабраў аматараў, ацэнку іх творчасці давалі выключна прафесіяналы, сярод якіх — вядучы майстар сцэны Магілёўскага драмтэатра Аляксандр П'янзін, старшыня цыклавой камісіі тэатральных дысцыплін Магілёўскага каледжа мастацтваў Анжаліка Мельнікава.

Тэатральныя эксперыменты, як сведчыць фестываль, адбываюцца не толькі на прафесійнай сцэне. Чаго толькі варта выступленне тэатра-студыі «Шостае пачуццё» Дома культуры прадпрыемства «Метыз» Беларускага таварыства глухіх! Весела, яскрава, незвычайна. Іх «Прагулка для недушэўна хворых» уразіла сваёй нестандартнасцю.

— Нягледзячы на тое, што ўдзельнікі нашага тэатра глуханямыя, яны вельмі добра адчуваюць сэрцам,— кажа звукааператар і «голас» калектыву Вольга Мельнікава.— А размаўляем мы на мове пластыкі. І, каб не стаяць на месцы, кожны год прымаем удзел у фестывалях вулічных тэатраў у Санкт-Пецярбургу, Яраслаўлі, Туле.

Мінскі народны тэатр «Рэха» праз тры гады адзначыць свой 60-гадовы юбілей. Па словах яго кіраўніка Андрэя Жураўскага, у калектыве ёсць жанчына, якая прыйшла ў тэатр, калі ён толькі адкрыўся. Зараз ёй амаль 75 гадоў. Сам Андрэй Жураўскі пачынаў свой творчы шлях у якасці акцёра ў 1985 годзе, потым дарос да рэжысёра. І такіх адданых тэатру непрафесіяналаў хапае. А фестывалі надаюць іх справе сэнс. На жаль, магілёўскі — пакуль адзіны ў Беларусі.

Тое, што аматарскі тэатр цікавы не толькі для яго ўдзельнікаў, але і для гледачоў, было прыкметна па іх колькасці. У суботу і нядзелю некаторыя нават не пакідалі сцен пляцовак, дзе адбываліся тэатральныя падзеі, глядзелі запар па некалькі пастановак.


Гран-пры атрымаў народны тэатр «Валянцін».
Фота Галіны ГАЎРЫЛОВІЧ.

***Гран-пры адкрытага фестывалю аматарскіх тэатральных калектываў «Святло рампы» атрымаў народны тэатр «Валянцін» Магілёўскага гарадскога Цэнтра культуры і вольнага часу.*** Яго пастаноўка «Кабала святош» па п'есе Міхаіла Булгакава пра жыццё і творчасць вялікага французскага камедыёграфа Жана-Батыста дэ Мальера была прызнана лепшым спектаклем. А кіраўніку тэатра Алегу Загароўскаму, які сыграў Мальера, дастаўся яшчэ і дыплом за лепшую мужчынскую ролю.

Прызам за лепшую жаночую ролю адзначана актрыса народнага аматарскага тэатра Аршанскага гарадскога Цэнтра культуры Алена Дзеравянка (спектакль «Няпрошаны госць»). А лепшай рэжысёрскай працай прызнаны спектакль «Тры навелы пра каханне» народнага моладзевага тэатра «Легіён» Палаца культуры Мазырскага нафтаперапрацоўчага завода. Акрамя асноўных намінацый, удзельнікам форуму былі ўручаны спецыяльныя прызы. Дарэчы, прыз глядацкіх сімпатый ад аматарскага аб'яднання рамеснікаў «Магілёўскія майстры» дастаўся тэатру-студыі «Шостае пачуццё». Некалькім калектывам журы фестывалю ўручыла свае ганаровыя граматы.

— Сёлета было вельмі складана выбраць пераможцаў, таму што кожны калектыў незвычайны, у кожнага — уласны твар,— адзначыў старшыня журы конкурснай праграмы фестывалю Рыгор Баравік.

Спатрэбілася нават увесці 7 дататковых дыпломаў, каб адзначыць усіх дастойных,— дадала член журы фестывалю, галоўны спецыяліст упраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Магілёўскага гарвыканкама Алена Мяжэніна.

Дарэчы, гэты фестываль запомніцца яшчэ і тым, што ў яго рамках выступіў знакаміты расійскі акцёр, кіраўнік маскоўскага тэатра «Сатырыкон» Канстанцін Райкін. Гэта быў падарунак Міністэрства культуры Расійскай Федэрацыі Магілёву як культурнай сталіцы Беларусі і краін СНД. Мона-спектакль Райкіна «Сваім голасам», дзе ен распавёў пра пачатак творчага шляху, свайго легендарнага бацьку, тэатр увогуле, стаў яркім завяршэннем фестывалю.

Магілёў ужо з'яўляецца сталіцай міжнароднага моладзевага тэатральнага форуму «Март-кантакт», які нязменна збірае вялікую колькасць сваіх прыхільнікаў. На гэты раз ішла гаворка аб тым, каб гарадскі фестываль аматарскіх тэатраў атрымаў статус рэспубліканскага. Можа, так яно і будзе?

**Нэлі ЗІГУЛЯ**




*Пахмурных дзён няўмольны вынік —*
*Спыніўся сонечны гадзіннік...*
*А што рабіць, калі туман*
*Ад явы цягне у падман,*
*Яднаючы бясчассем нас*
*Усіх, хто прагне ведаць час.*
*Гадзіннік скораны ляжыць,*
*А час усё адно — ляціць...*
*Вер, на зямлі туман не вечны —*
*Праб'ецца сонечны праменьчык.*

## ІНТЭЛЕКТУАЛЬНЫЯ ГУЛЬНІ

23 і 24 лістапада ў Мінску пройдзе IX Міжнародны турнір Акадэміі МУС Рэспублікі Беларусь па інтэлектуальных гульнях «Шчыт і меч».

Турнір праводзіцца ў два этапы. У інтэлектуальнай гульні «Эрудыт-квартэт» адначасова ўдзельнічаюць па 3–4 каманды. У кожным раўндзе разыгрываюцца пяць аб'яднаных агульнай тэмай пытанняў. Інтэлектуальная гульня «Што? Дзе? Калі?» складаецца з чатырох блокаў па 15 пытанняў. На кожнае заданне адводзіцца ўсяго адна хвіліна.

Спаборнічаць будуць 36 каманд (больш як 200 чалавек) з Беларусі, Расіі і Украіны. Акрамя студэнтаў, удзел у мерапрыемстве возьмуць і курсанты Акадэміі МУС, Ваеннай акадэміі, Інстытута нацыянальнай бяспекі, Інстытута пагранічнай службы, Камандна-інжынернага інстытута МНС.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

■ Не толькі з нагоды

# Ёсць усё: ад газет да кавы

**Цяжка сабе ўявіць чалавека, які ні разу ў жыцці не купіў нешта ў кіёску нацыянальнай сістэмы «Саюздрук». Можа, толькі малыя дзеці, у якіх яшчэ няма кішэнных грошай. У наш час у кіёсках, павільёнах можна выбраць тавар больш як з 1,2 тысячы найменняў: ад свежых нумароў газет, часопісаў да кавы і іншага.**


Людміла ГАЙДУК.

95 гадоў распаўсюджваннем штодзённага перыядычнага друку займаецца гандлёвае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Віцебскаблсаюздрук». Карэспандэнт «Звязды» пагутарыў з **дырэктарам прадпрыемства Людмілай ГАЙДУК,** якая ўзначальвае калектыў колькасцю каля пяцісот чалавек.

**— Людміла Віктараўна, традыцыйна напярэдадні юбілеяў падводзяць вынікі працы. Чым ваш калектыў можа ганарыцца? Ці ёсць асаблівыя нагоды для гонару?**

— Падчас існавання цяперашняга прадпрыемства «Віцебскаблсаюздрук» былі розныя перыяды, рэарганізацыі. Але задачы сістэмы за 95 гадоў не змяніліся. Галоўная з іх — рэалізоўваць свежыя нумары газет і часопісы. Былі і вельмі цяжкія часы, калі кіёскі працавалі толькі некалькі дзён на тыдзень. Але сістэма распаўсюджвання перыядычнага друку захавалася. Займаемся рознічным гандлем, але маем сваю ўнікальную спецыфіку…

Калі параўноўваць працу «Віцебскаблсаюздрука» з аналагічнымі прадпрыемствамі, можа, і няправільна будзе «рапартаваць» аб нейкіх асаблівых дасягненнях, прызавых месцах. Сістэма працуе паўсюды аднолькава. Безумоўна, ёсць адрозненні. Напрыклад, у мінчан большы сярэдні заробак, але, зразумела, у сталіцы так і павінна быць. У нас у гэтым пытанні «бронза». Што да прыбытку, ён у нас больш як 1 мільярд рублёў. А ў тым жа Мінску, для параўнання, каля 5 мільярдаў.

Сёлета мы інвесціравалі ў развіццё вытворчай базы каля 2 мільярдаў рублёў — гэта нямала. Думаю, год завершым добра. І будзем імкнуцца да лепшага.

**— Колькі рэдакцый аддаюць на рэалізацыю газеты і часопісы?**

— Больш як 150 рэдакцый супрацоўнічаюць з намі. Рэалізуем каля 800 газет і часопісаў. Таксама ёсць беларускія партнёры, якія прадастаўляюць нам друкаваную і іншую прадукцыю расійскай вытворчасці. Але каля 80% з усіх СМІ — беларускія газеты і часопісы. І што магу падкрэсліць, апошнія — канкурэнтаздольныя, запатрабаваныя.

**— Калі не сакрэт, працэнт рэалізацыі друкаванай прадукцыі ўпаў за апошнія гады?**

— Гэты паказчык — 34%. Лічу, што інтэрнэт насамрэч газетам канкурэнт. Ды і колькасць нашых пакупнікоў, на жаль, памяншаецца, асабліва ў глыбінцы. Таму прыходзіцца закрываць нерэнтабельныя гандлёвыя пункты. Але пры гэтым, добра разумеючы, што гандаль не будзе прыбытковым, усё роўна не закрываем нашы «пункты». Напрыклад, у бальніцах. Захоўваем кіёскі і ў райцэнтрах, дзе яны не прыносяць прыбытку, бо разумеем сацыяльную значнасць нашай працы.

**— А як раскупляюцца розныя калекцыі: машынкі, насякомыя, мінералы, лялькі?**

— Вельмі добра! Зараз рэалізуем каля трыццаці калекцый. Раз у паўгоддзе запускаюцца тры-чатыры новыя праекты.

**— Дарэчы, пытанне ад чытачоў: калі ўрэшце будуць прадаваць калекцыю гадзіннікаў?**

— І гэтая калекцыя да нас прыйдзе. Думаю, што ў першым паўгоддзі 2014-га. Вельмі актыўна зараз купляюць калекцыі манет, часопісы пра варажбу…

**— Калі не камерцыйная тайна, заробак тых жанчын, што працуюць у кіёсках і павільёнах, на ўзроўні сярэдняга па краіне?**

— Пакуль што, на жаль, не. Але адпаведны план па росце аплаты працы за першыя сёлетнія дзевяць месяцаў выкананы. У параўнанні з мінулым годам заробак павысіўся на 46%. Безумоўна, хочацца, каб ён быў большы.

Летась былі часовыя праблемы, звязаныя з недахопам кадраў, але сітуацыя стабілізавалася. Безумоўна, наша сістэма трымаецца на тых людзях, хто адпрацаваў па дзесяць і больш гадоў. Такіх у нас каля 30%. Гэта — вопытныя і граматныя супрацоўнікі, якія разумеюць спецыфіку сістэмы. Яны не скардзяцца на цяжкасці і працуюць. А працоўнае месца кіяскёра часта не вельмі камфортнае: зімой бывае халаднавата, летам — вельмі спякотна.

Хочацца падзякаваць за добрасумленную працу нашым самым вопытным працаўнікам: Аляўціне Пятроўне Міснік з Лепеля, Таццяне Іванаўне Рымко з Паставаў і іншым. Усе без выключэння ў сувязі з юбілеем прадпрыемства атрымаюць матэрыяльную дапамогу. Некаторых узнагародзім ганаровымі граматамі, уручым сувеніры і падарункі ад нашых партнёраў.

Дарэчы, па традыцыі нашы работнікі атрымліваюць падарункі перад навагоднімі святамі, міжнародным жаночым днём, іншымі святамі. Прафсаюз добра працуе: набываюць білеты ў тэатр, на мерапрыемствы міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» і гэтак далей. Напрыклад, сёлета ездзілі на экскурсію ў Адэсу.

**— Ці з'явяцца ў бліжэйшы час новыя павільёны, больш зручныя для кліентаў і работнікаў?**

— У Віцебску недалёка ад аўтавакзала ўстановім павільён новага ўзору плошчай 25 «квадратаў». І ён стане трэцім у абласным цэнтры. Таксама павільёны ўжо ёсць у Оршы і Полацку. Зараз павільён каштуе вялікіх грошай — 250 мільёнаў рублёў. Таму немагчыма адразу ўстанавіць такія сучасныя павільёны ў кожным райцэнтры.

**— А што перашкаджае больш актыўнаму развіццю юрыдычна самастойнай бізнес-структуры?**

— Не можа не хваляваць такі момант. Як унітарнае прадпрыемства, мы з чыстага прыбытку плацім падатак — 20% (летась: толькі 5%.— **Аўт.**), плюс яшчэ падатак на прыбытак. У выніку палова з таго, што зарабляецца, ідзе на падаткі. Гэта ўплывае і на тое, што мы не можам такімі тэмпамі, як хацелася б, павялічваць той жа ўзровень аплаты працы.

Калі раней мы актыўна карысталіся крэдытамі, бралі павільёны ў лізінг, дык сёлета і спроб не рабілі ў гэтым кірунку. Крэдыты вельмі дарагія, умовы лізінгу — не выгадныя. Усё гэта стрымлівае развіццё прадпрыемства.


У павільёне № 5 «Віцебскаблсаюздрука». Прадавец Наталля Лісіцына і пакупніца, студэнтка 3 курса медуніверсітэта Настасся Фядусава.

А планы ў нас, безумоўна, вялікія. Сярод іх — і працяг развіцця гандлёвай сеткі. Завяршаем праект па ўводзе ў эксплуатацыю ў наступным годзе нашай недабудаванай базы ў Віцебску. Усё гэта патрабуе вялікіх фінансавых укладанняў. Добра, што раней набылі транспарт, каб забяспечваць прадукцыяй нашы раённыя аддзяленні,— грузавік «Мерседэс».

Вядома, што ў наступным годзе Віцебшчына прыме рэспубліканскае свята «Дажынкі», якое пройдзе ў Гарадку. Трэба будзе прывесці ў парадак будынак нашага прадстаўніцтва, фірменныя гандлёвыя пункты.

**— Як пастаянны пакупнік, часам задумваюся: няўжо каву купляюць у кіёсках? Напэўна, у краме, на рынку яна значна танней?**

— Паверце мне, купляюць вельмі добра, як і чай, а таксама салодкую прадукцыю віцебскага прадпрыемства «Віцьба», іншых беларускіх вытворцаў. Прадукты харчавання ў агульным асартыменце на ўзроўні каля 20%. Попыт нараджае прапановы. Не паспяваем часта завозіць тавар.

**— А вы самі што купляеце?**

— Часопісы, зубную пасту, дробязь розную, падарункі для сваіх унукаў — напрыклад, пластыкавыя цацкі беларускай вытворчасці. Цэны сярэднія, бо мы арыентуемся на пакупніка з сярэднім дастаткам. Калі раней нацэнка на рознічны друк была каля 55%, цяпер — 35%.

**— Быў час, калі сувенірная прадукцыя з выявай сімвалаў Віцебска і Полацка з'яўлялася дэфіцытам. Як зараз?**

— Яна вельмі запатрабаваная, бо штогод прымаем усё больш турыстаў, асабліва летам. Выбар цяпер багаты: магніты, паштоўкі на памяць аб кожным раёне Віцебшчыны… Добра купляюць сувеніры і падчас раённых свят. У прыватнасці, сёлета першы вішнёвы фэст у Глыбокім стаў для нас вельмі прыбытковым, бо сімвал свята — вішня — разыходзіўся як гарачыя піражкі.

**— Ужо рэалізуеце сувенірную прадукцыю, прысвечаную чэмпіянату свету па хакеі ў Мінску?**

— Так. Больш як з дзесяццю вытворцамі заключаны адпаведныя дамовы.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
**Фота аўтара.**

***P. S.*** *Разам з нашым пазаштатным фотакарэспандэнтам Віктарам Нікалаевым мы зайшлі ў павільён № 5, які знаходзіцца ў самым цэнтры Віцебска — каля комплексу знакамітага на ўвесь свет Летняга амфітэатра. Прадавец павільёна Наталля Лісіцына расказала, што ў яе ёсць пастаянныя кліенты, некаторыя купляюць нават старыя нумары «Звязды», калі ў іх надрукаваны цікавыя публікацыі. Сам жа павільён працуе з раніцы да вечара*

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика** | - Капитальное строение, инв. № 400/С-38149 (назначение – здание административно-хозяйственное), (принадлежности: тепловая, канализационная (фекальная) сеть), г. Гродно, ул. Победы, 20, 2-этажное, кирпичное, 1987 г. п., S общ. – 251,3 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-55780 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – материальный склад), г. Гродно, ул. Победы, 20/2, 1964 г. п., кирпичное, S общ. – 2701,3 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-53918 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад № 3), (принадлежность: топочная; эстакада), г. Гродно, ул. Победы, 20/3, 1993 г. п., кирпичное, S общ. – 171,0 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-55782 (назначение – здание нежилое, наименование – пилорама), г. Гродно, ул. Победы, 20/4, кирпичное, 1970 г. п., S общ. – 150,6 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-2900 (назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – гараж для тракторов), г. Гродно, ул. Победы, 20/5, кирпичное, 1993 г. п., S общ. – 199,1 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-55738 (назначение – здание нежилое, наименование – водонасосная), г. Гродно, ул. Победы, 20/6, кирпичное, 1982 г. п., S общ. – 45,7 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-49804 (назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – гараж на 7 машин), г. Гродно, ул. Победы, 20/7, кирпичное, 1987 г. п., S общ. – 285,3 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-49807 (назначение – здание многофункциональное – весовая с гаражом), (составные части: гараж), г. Гродно, ул. Победы, 20/8, кирпичное, 1963 г. п., S общ. – 93,1 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-3112 (назначение – здание нежилое, наименование – сушильная камера-мастерская), г. Гродно, ул. Победы, 20/9, кирпичное, 1993 г. п., S общ. – 64,5 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-19819 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад для металла), г. Гродно, ул. Победы, 20/10, кирпичное, 1963 г. п., S общ. – 682,8 кв.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-2864 (назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – гараж на 6 автомашин), г. Гродно, ул. Победы, 20/11, кирпичное, 1987 г. п., S общ. – 150,7 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-3376 (назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – гараж на три места), г. Гродно, ул. Победы, 20/12, кирпичный, 1993 г. п., S общ. – 182,7 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-55741 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад горючих и масел с гаражом и заправочной), г. Гродно, ул. Победы, 20/13, кирпичное, 1963 г. п., S общ. – 67,7 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-55743 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад химпродуктов), г. Гродно, ул. Победы, 20/14, кирпичный, 1990 г. п., S общ. – 47,7 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-50180 (назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – гараж для легкового транспорта), г. Гродно, ул. Победы, 20/15, кирпичное, 1994 г. п., S общ. – 69,0 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-55737 (назначение – здание нежилое, наименование – насосная станция для перекачки кислот и горючих материалов), г. Победы, 20/16, кирпичная, 1963 г. п., S общ. – 8,5 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-55739 (назначение – здание нежилое, наименование – уборная на 2 очка), г. Гродно, ул. Победы, 20/17, кирпичное, 1963 г. п., S общ. – 6,4 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-55740 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – пожарный резервуар на 300 м3), г. Гродно, ул. Победы, 20, бетон, 1964 г. п., S общ. – 75 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-53259 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – проезд), (принадлежность две ц/б площадки), г. Гродно, ул. Победы, 20, S общ. – 5957,0 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-53253 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – водопроводная сеть), г. Гродно, ул. Победы, 20, чугун, сталь, 1979 г. п., протяж. 0,146 км.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-53262 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – ограждение территории), (принадлежности: ворота автомобильные металлические, ворота автомобильные механические металлические).<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-55781 (назначение – здание нежилое, наименование – проходная), (принадлежность – канализация фекальная), 1963 г. п., кирпичное, S общ. – 58,9 кв.м.<br>- Кабельная линия электропередач 0,4 кВт, г. Гродно, ул. Победы, 20.<br>- Воздушная линия электропередач 0,4 кВт, г. Гродно, ул. Победы, 20. |
| **Местонахождение объекта** | г. Гродно, ул. Победы, 20 |
| **Лот расположен на земельном участке** | Кадастровый номер 440100000001001667, площадью 1,6481 га (назначение – земельный участок для содержания и обслуживания производственной базы) |
| **Начальная цена продажи** | 7 607 353 792 (семь миллиардов шестьсот семь миллионов триста пятьдесят три тысячи семьсот девяносто два) белорусских рубля без учета НДС |
| **Сумма задатка** | 380 367 690 (триста восемьдесят миллионов триста шестьдесят семь тысяч шестьсот девяносто) белорусских рублей |
| **Продавец** | Ликвидационная комиссия РУПП «Гроднотекстиль», 230015, г. Гродно, ул. Горького, 121, тел./факс 43-99-64 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34 |
| **Условия аукциона** | Без условий |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225. |

**Аукцион состоится 4 декабря 2013 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209.**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицам – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Извещение о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» № 178 (27543) от 21.09.2013 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30.**

**Последний день приема заявлений – 28 ноября 2013 г. до 15.00.**

**Телефоны для справок: 41-98-32, 41-98-34 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки».**

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

## строительства объекта «Два многоквартирных жилых дома в микрорайоне № 4 реконструируемой застройки в границах улиц Шаранговича, Горецкого, Рафиева (бывшая деревня Сухарево). Жилой дом № 3 по г/п – 1 пусковой комплекс. Жилой дом № 3а по г/п – 2 пусковой комплекс»

Данная проектная декларация отменяет действие проектной декларации строительства объекта «Два многоквартирных жилых дома в микрорайоне № 4 реконструируемой застройки в границах улиц Шаранговича, Горецкого, Рафиева (бывшая деревня Сухарево). Жилой дом № 3 по г/п – 1 пусковой комплекс. Жилой дом № 3а по г/п – 2 пусковой комплекс», опубликованной в газете «Звязда» 30 октября 2013 г. (№ 205 (27570)).

**ИНФОРМАЦИЯ О ЗАСТРОЙЩИКЕ**

Общество с ограниченной ответственностью «Белстройинвестпроект» (ООО «Белстройинвестпроект»).

**Место нахождения:** г. Минск, площадь Свободы, д. 4, 3 этаж.

**Режим работы:** понедельник – пятница с 9.00 до 18.00, обеденный перерыв с 13.00 до 13.45, выходные дни – суббота, воскресенье.

**Государственная регистрация застройщика:** Общество с ограниченной ответственностью «Белстройинвестпроект» зарегистрировано Минским городским исполнительным комитетом 12 мая 2006 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190545729.

В проектах строительства жилых домов и иных объектов недвижимости в течение трех лет, предшествующих заключению договора, ООО «Белстройинвестпроект» участие не принимало.

**ИНФОРМАЦИЯ ОБ ОБЪЕКТЕ СТРОИТЕЛЬСТВА**

**Цель строительства:** строительство двух многоквартирных жилых домов №№ 3, 3а (по генплану) в микрорайоне № 4 реконструируемой застройки в границах улиц Шаранговича, Горецкого, Рафиева (бывшая деревня Сухарево) в г. Минске.

**Этапы и сроки реализации строительства:** первый пусковой комплекс: начало строительства – декабрь 2013 г., завершение строительства – июнь 2014 г.; второй пусковой комплекс: начало строительства – февраль 2014 г., завершение строительства – июль 2014.г.; благоустройство и озеленение – 3 квартал 2014 г.

**Государственная экспертиза проектной документации:** экспертные заключения № 685-15/13 от 27.08.2013 г. и 794-15/13 от 27.09.2013 г., выданные Республиканским унитарным предприятием «Главгосстройэкспертиза».

**Местонахождение строящихся многоквартирных жилых домов:** г. Минск, микрорайон № 4 реконструируемой застройки в границах улиц Шаранговича, Горецкого, Рафиева (бывшая деревня Сухарево).

**Характеристика строящихся многоквартирных жилых домов:** сблокированный жилой дом на 204 квартиры в конструкциях серии 3А-ОПБ, условно поделенный на два дома № 3 и № 3а по генеральному плану. Жилой дом № 3 (3 секции) относится к первому пусковому комплексу; жилой дом № 3а (2 секции) относится ко второму пусковому комплексу. Жилой дом № 3 – десятиэтажный на 126 квартир, состоит из 3-х секций. В объеме технического подполья, в секции 1-2 предусмотрены технические помещения – узел учета тепла и водомерный узел, в секции 3-4 запроектирован тепловой пункт. На первом этаже жилого дома, в секции 1-2 предусмотрена пристроенная электрощитовая с отдельным входом снаружи, а также группа помещений для работы товарищества собственников в секции 3-4 с автономным входом. Жилой дом № 3а – десятиэтажный на 78 квартир, состоит из 2-х секций. На первом этаже жилого дома, в секции 4-5 запроектирована пристроенная электрощитовая с отдельным входом снаружи. Каждая секция оборудована мусоропроводом и пассажирским лифтом. Все квартиры имеют летние помещения (остекленные лоджии). Под лоджиями квартир 1-го этажа проектом предусмотрены погреба. Здания запроектированы с техническим подпольем и теплым чердаком. Кровля плоская, рулонная с внутренним водостоком, включающая отдельные элементы с покрытием из профнастила. Высота жилого этажа – 2,8 м. Наружная отделка: стены – покрытие защитно-декоративным полимерным составом и покраска водно-дисперсионными фасадными красками; окна – ПВХ-профиль с заполнением двухкамерным стеклопакетом, двери – по СТБ 1138-98, СТБ – 1394-2003, СТБ – 1647-2006. Источник теплоснабжения – наружные тепловые сети. Проектом предусмотрена поквартирная система отопления. Каждая ветка поквартирной системы оборудуется теплосчетчиком, отключающей, регулирующей и дренирующей арматурой, устанавливаемой в специальных шкафах, исключающих несанкционированный доступ посторонних лиц. В качестве нагревательных приборов приняты панельные радиаторы типа «Лидея». Из каждой квартиры отработанный воздух удаляется из кухни и санитарных помещений посредством естественной канальной вентиляции через железобетонные вентблоки. Приток воздуха осуществляется через открываемые створки окон, которые оборудуются механизмами притвора. Снабжение жилых домов холодной водой для хозяйственно-питьевых нужд осуществляется от ранее запроектированных сетей водопровода. Для каждой квартиры предусматриваются устройства внутриквартирного пожаротушения. Снабжение горячей водой – от водонагревательной установки, размещенной в помещении теплового пункта ИТП. Отведение бытовых сточных вод предусматривается самотеком в наружную одноименную сеть канализации. Канализационные сети монтируются из пластмассовых канализационных труб; вытяжная часть стояков – из чугунных труб. Проектом предусматривается автоматизация учета потребления тепла, автоматическое регулирование системы отопления и горячего водоснабжения, автоматизированная система учета и контроля потребляемой электроэнергии АСКУЭ. Расчетный учет расходуемой электроэнергии для квартир осуществляется электронными трехфазными многотарифными счетчиками активной энергии, установленными в этажных щитках. Для искусственного освещения применены энергосберегающие светильники с электронными пускорегулирующими аппаратами. Используются средства автоматического включения-отключения освещения в местах общего пользования при помощи фотореле. Для телефонизации жилых домов проектом предусмотрен ввод магистрального волоконно-оптического кабеля. В квартирах предусмотрена установка оптических абонентских коробок. Проектом предусмотрено строительство гибридной оптико-волоконной коаксиальной системы кабельного телевидения с подключением по волоконно-оптической линии связи. Проектом предусмотрено охранно-переговорное устройство «ПИРРС-1000М», предназначенное для ограничения доступа посторонних лиц в подъезды жилого дома. В жилых помещениях предусмотрена установка извещателей пожарных. Общее количество квартир в домах №№ 3, 3а – 204, в том числе: дом № 3: однокомнатных – 57 ед., двухкомнатных – 57 ед., трехкомнатных – 12 ед.; дом № 3а: однокомнатных – 38 ед., двухкомнатных – 38 ед., трехкомнатных – 2 ед. Чистовая отделка квартир, предназначенных для коммерческой реализации, не выполняется.

**Количество предлагаемых объектов долевого строительства**: 50 единиц.

**Цены на объекты долевого строительства:**
однокомнатные квартиры – **12 100 000** рублей за 1 кв.м общей площади;
двухкомнатные квартиры – **11 700 000** рублей за 1 кв.м общей площади;
трехкомнатные квартиры – **11 000 000** рублей за 1 кв.м общей площади.

**Условия оплаты:** уплата цены объекта долевого строительства производится дольщиком единовременно не позднее 5 (пяти) календарных дней с момента регистрации договора создания объекта долевого строительства в местном исполнительном и распорядительном органе. По соглашению сторон, уплата цены объекта долевого строительства может быть произведена дольщиком поэтапно в установленный договором период по графику платежей. По соглашению сторон, дольщику может быть предоставлена скидка от общей стоимости квартиры.

**Условия возможного изменения цены строительства застройщиком в одностороннем порядке:** изменение статистических индексов стоимости строительно-монтажных работ; изменение законодательства об уплате косвенных налогов.

**Права застройщика на земельный участок:** решение Минского городского исполнительного комитета от 27 сентября 2013 г. № 2397 «Об изъятии, предоставлении земельных участков, разрешении строительства и внесении изменений в решения Мингорисполкома».

**Границы земельного участка:** ул. Шаранговича – ул. Горецкого – ул. Рафиева в г. Минске.

**Площадь земельного участка:** 1,0554 га.

**Элементы благоустройства:** проектом предусмотрено полное благоустройство территории с организацией подъезда, парковками общей вместительностью на 46 машино-мест, тротуаром для пешеходов, проездами с шириной проезжей части не менее 5,5 метра, разворотной площадки и пешеходных дорожек по основным направлениям движения пешеходов. На прилегающей территории запроектированы: площадка для крупногабаритного мусора, площадка для отдыха и детская игровая площадка, места для парковки автомобилей инвалидов.

**Количество в строящихся жилых домах и иных объектах недвижимости самостоятельных частей, передаваемых застройщиком дольщикам после ввода жилых домов в эксплуатацию:**

Общее количество квартир – 204 ед., в том числе:
- однокомнатных квартир – 95 (общая площадь от 42,89 кв.м до 43,34 кв.м);
- двухкомнатных квартир – 95 (общая площадь от 58,56 кв.м до 64,61 кв.м);
- трехкомнатных квартир – 14 (общая площадь от 82,22 кв.м до 88,04 кв.м).

